WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 КРАСАВІКА 2011 г.
СУБОТА
№ 76
(26940)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Хрысціянам Беларусі

***Дарагія суайчыннікі!***

Сардэчна віншую Вас з Пасхай Хрыстовай.

Што сімвалізуе гэтае свята для ўсіх нас? Перш за ўсё высокую ісціну евангельскіх запаветаў, якія заклікаюць цаніць каштоўны дар жыцця, захоўваць мір ва ўласнай душы, у коле блізкіх і сяброў, у сваёй краіне, любіць людзей, быць спачувальнымі і міласэрнымі.

Менавіта гэтыя якасці, выхаваныя хрысціянскай верай, сталі неад'емнымі рысамі нацыянальнага характару беларусаў. Увесь свет ведае, што Белая Русь — зямля мірных, добрых, спагадлівых людзей.

Сёлета Вялікдзень адзначаюць разам паслядоўнікі ўсіх хрысціянскіх цэркваў. Для нашай шматканфесійнай Беларусі гэта падзея напоўнена асаблівым сэнсам. Мы моцныя, таму што адзіныя, таму што заўсёды дапамагаем адно аднаму.

Дык няхай вялікая ўрачыстасць Уваскрасення Хрыстова, якое ўвасабляе перамогу праўды і дабра, прынясе ўсім нам надзею і веру ў будучыню. Няхай спакой і згода пануюць у кожным доме, у кожнай сям'і, а святло і цяпло гэтых святых дзён азараюць і саграваюць нас увесь год. І няхай Гасподзь ахоўвае нашу Айчыну ад бед і напасцяў.

Моцнага вам здароўя, дабрабыту і веснавога настрою.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «У БЕЛАРУСІ БЫЛО ПРАДУХІЛЕНА НЕКАЛЬКІ ВЫБУХАЎ»

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб ходзе раскрыцця і расследавання абставін выбуху 11 красавіка ў мінскім метро, перадае БЕЛТА.**

«Наша шчасце, што мы затрымалі гэтых нягоднікаў і прадухілілі некалькі такіх падзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, гэта пацвярджаюць следчыя дзеянні. У той жа час Прэзідэнт дадаў, што без адказу пакуль застаецца пытанне аб саўдзельніках і заказчыках тэракта, калі яны ёсць.

Паводле яго слоў, у будучыні ні ў якім разе нельга дапусціць паўтарэння такога. «Але для гэтага вельмі важна знайсці людзей, якія мелі хоць нейкае дачыненне да гэтага», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для яго вельмі важна трымаць руку на пульсе. «Спрабуючы выбудаваць нейкую сістэму ўдзелу ў расследаванні тэракта, я атрымліваю практычна ў рэжыме рэальнага часу інфармацыю ад аператыўных груп, якія працуюць па крымінальнай справе, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта крымінальная справа павінна быць за сцісламі тэрмін і якасна даведзена да суда».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на тую аператыўнасць, з якой працавалі і працягваюць працаваць усе асобы, якія вядуць следства і адказваюць за яго. Пры гэтым ён падкрэсліў, што «ні ў якім разе нельга дапускаць як паслабленняў, так і нейкіх празмернасцяў у гэтай крымінальнай справе». «Таму што гэта асаблівая крымінальная справа, і яна застанецца не проста ў архівах, але і ў гісторыі нашай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

«Усё павінна быць па законе, сумленна і справядліва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт прапанаваў кожны тыдзень збірацца ў такім складзе, разглядаць прамежкавыя вынікі, не ўмешваючыся ў ход следчых мерапрыемстваў.

# «У БОЖЫНЕ БОГ ЖЫВЕ!»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Божын прапісаўся вельмі даўно. З часоў Вялікага Княства Літоўскага. Адпаведна знойдзеным у архівах звесткам — з 1440 года. У гэты час вялікі князь ВКЛ Альгерд падараваў Божына князю Нарушэвічу. Але ў вёсцы, зразумела, узрост яшчэ большы...**

**Сёння ў Божыне Бярэзінскага раёна жыве каля паўсотні чалавек. Наколькі кожны з іх шчыры вернік, сказаць цяжка. Але ёсць свая царква, і гэтым шмат сказана. А вось у доме Галіны Кулічок жыццё сапраўды цячэ па Божых законах. Па кутах хаты вісяць абразы, адзначаюцца святы, і кожную нядзелю — дарога ў царкву. Бог даў гаспадыні шмат гадоў жыцця, даў дзяцей і ўнукаў. Меншаму з іх, Кірылу, толькі восем гадочкаў. А Галіне Апанасаўне сёлета — восемдзесят.**

**Восем і восемдзесят! Уражвае і вельмі сімвалічна. Вось чаму галоўным здымкам на першую старонку перадвелікоднай «Звязды» мы абралі менавіта здымак з акном пад птушкамі. Галубы — птушкі Божыя. Нездарма майстар і ўпрыгожыў імі вокны божынскай хаты. На здымку ў акне Галіна Кулічок з сынам Генадзем і ўнукам Кірылам.**

СТАР. 3

# ЛІКУЕ СЭРЦА! РАДУЕЦЦА РОЗУМ! СВЯТКУЕ ВОЛЯ!

## Пасхальнае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага ФІЛАРЭТА, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Гэтыя словы, падобна сонечнаму промню, разганяюць начную цемру і абвяшчаюць раніцу жыцця, сцвярджаюць Царства благадаці і радасць аб Уваскрэслым Госпадзе!

«Хрыстос Уваскрэс»! — лікуе сэрца!

«Хрыстос Уваскрэс»! — радуецца розум!

«Хрыстос Уваскрэс»! — святкуе воля, абноўленая подзвігам посту!

Нам зноў і зноў хочацца паўтараць гэтыя словы. Уся наша істота жадае напоўніцца благадаццю Уваскрэслага Бога, таму што мы з вамі — удзельнікі радасці Прасвятой Багародзіцы, радасці апосталаў і вучняў Хрыстовых, радасці ўсіх святых...

Пройдзены шлях Святой Чатырохдзясятніцы. Мы слухалі пакаянныя спевы канона Андрэя Крыцкага. Падобна таму, як апосталы Лука і Клеопа ішлі ў Эмаус, мы, у сваім шэсці да Пасхі Хрыстовай, разважалі між сабою пра падзеі Пакутнага тыдня: *«што адбылося з Ісусам Назаранінам... як выдалі Яго... для асуджэння на смерць і распялі»* (Лк. 24, 15-20).

Усё наша жыццё — гэта шлях вучняў у Эмаус, шлях праз горыч сумнення да ззяння Пасхі Хрыстовай. Яго падзяляе з намі Сам Гасподзь. Як дабравесціць святы апостал Лука, *«калі яны размаўлялі і разважалі, Сам Ісус, наблізіўшыся, пайшоў з імі»* (Лк. 24, 15).

Узлюбленыя! Тое, што нам уяўляецца нашым, чалавечым шляхам да Бога, аказваецца ў той жа час шляхам, па якім Сам Гасподзь сыходзіць да нас. Часам нам здаецца, што мы адзінокія... Але гэта Гасподзь навучае нас цішыні, у якой загучыць Пасхальны дабравест! Мы думаем, што нас зневажаюць... Але гэта Гасподзь дае нам магчымасць далучыцца да Крыжа, каб і ў нашай душы заззяла святло Уваскрасення Хрыстовага!

СТАР. 2

# УВАСКРОСЛЫ ХРЫСТУС — НАДЗЕЯ СУЧАСНАГА СВЕТУ

## Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша КАНДРУСЕВІЧА на Вялікдзень 2011 года

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, вернікі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі!

Гэтымі словамі вялікоднага прывітання ўсіх вас вітаю і віншую са святам святаў — Пасхай нашага Пана Езуса Хрыста. Слова «сапраўды» азначае факт уваскрасення і з'яўляецца той абсалютнай праўдай, на якой апосталы абапіралі сваю місію.

Уваскрасенне Хрыста з'яўляецца падмуркам нашай веры. Без фізічнага ўваскрасення Езуса няма збаўлення. Калі б Езус ляжаў у грабніцы забальзамаваны, як ляжаць некаторыя вядомыя дзеячы гісторыі, а мільёны наведвальнікаў і прыхільнікаў аддавалі б Яму пашану, то хрысціянства было б не больш, чым легенда. Нездарма св. апостал Павел кажа, што «калі Хрыстус не ўваскрос, то марнае і прапаведаванне нашае, і вера ваша марная» (1 Кар 15, 14).

Святое Пісанне прадстаўляе ўваскрасенне Езуса як гістарычны факт. Хрыста пасля ўваскрасення бачылі апосталы і іншыя людзі. Ён паводзіў сябе, як кожны жывы чалавек: размаўляў, заахвочваў дакрануцца да Яго, нават прасіў, каб далі Яму есці. Усё гэта пераканала Ягоных вучняў, што сустрэча з Уваскрослым была не галюцынацыяй, а рэчаіснасцю. Таму хрысціянства абапіраецца на факт уваскрасення Хрыста, бо без гэтага яно было б безжыццёвым.

Аднойчы французскі філосаф Аўгуст Комтэ сказаў, што мае намер заснаваць новую рэлігію, якая заслоніць хрысціянства, яна не будзе мець ніякіх таямніц, будзе вельмі простай і будзе называцца пазітывізмам.

СТАР. 2

Налвор'е

## ВЯСНА ПАРАДУЕ ЦЯПЛОМ

**У бліжэйшыя 5 дзён на тэрыторыі Беларусі захаваецца цёплае і спакойнае надвор'е.**

Аднак у суботу ў асобных раёнах будзе ісці невялікі дождж. У нядзелю кароткачасовыя ападкі будуць толькі месцамі на паўднёвым захадзе краіны, дзе магчымы невялікія навальніцы. На астатняй тэрыторыі сонечна. Тэмпература ўначы ў выхадныя 1—8 цяпла, удзень — ад 13 да 19, на поўдні Беларусі — да плюс 20—23 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Международный Резервный Банк

**ОАО «Международный резервный банк»**
220075, г. Минск, пер. Промышленный, 11
тел./факс: (017) 299 69 00, тел. (017) 299 69 02
e-mail: info@irb.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 апреля 2011 г.

ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.04.2011 г. | на 01.04.2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 505,6 | 1 082,2 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 131,0 | 73,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 7 693,8 | 4 859,5 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | | 4 109,9 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 11 536,7 | 6 871,5 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 224,5 | 913,2 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 921,1 | 967,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | | |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 1 461,7 | 939,4 |
| **13** | **ИТОГО активы** | **11** | | **22 474,4** | **19 816,5** |
| **14** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 3 227,6 | - |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 753,6 | 1 131,9 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 222,3 | 904,5 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 123,9 | 8,7 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 327,4 | 2 045,1 |
| **22** | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 16 137,8 | 16 137,8 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 313,7 | 313,8 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 174,2 | 66,2 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 521,3 | 1 253,6 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 18 147,0 | 17 771,4 |
| **29** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **22 474,4** | **19 816,5** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2011 г.

ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.04.2011 г. | на 01.04.2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 406,2 | 531,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 13,2 | 6,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 393,0 | 525,6 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 1 969,1 | 1 157,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 155,7 | 127,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 1 813,4 | 1 030,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | | 58,0 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 237,4 | 365,9 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | | |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 175,5 | 92,5 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 152,6 | 38,0 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 1 775,3 | 1 172,4 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 107,4 | 191,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 538,2 | 561,9 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 105,7 | 53,5 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **432,5** | **508,4** |

**И.о. Председателя Правления** **А.Е. Добровольский**
**Главный бухгалтер** **С.С. Ящук**
**Дата подписания 15 апреля 2011 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 от 01.01.2010 г.
Кор/счет 3200007350013 в РЦ НБ РБ, МФО 153001735. УНП 807000043.

# КАЛІ АД ВАЛЮТЫ «АДЧЭПЯЦЦА» ЧЭРГІ?

**Літаральна ў бліжэйшыя дні, у маі, валютны рынак Беларусі павінен стабілізавацца, попыт насельніцтва ў валюце будзе задаволены. А пакуль чэргі ля абменнікаў не знікаюць, супрацоўнікі аховы правапарадку раяць адэкватна ацэньваць сітуацыю і не набываць валютную наяўнасць у валютчыкаў. Парушэнне парадку правядзення валютных аперацый караецца штрафам у памеры да 3,5 млн рублёў з канфіскацыяй прадмета здзелкі.**

Як вядома, у краіне склалася адмоўнае сальда плацежнага балансу, пры якім імпартуецца больш, чым паступае экспартнай валютнай выручкі. Урад і Нацбанк распрацавалі шэраг мер, скіраваных на стабілізацыю сітуацыі. «На сёння мы правялі перамовы з Расіяй адносна знешняй пазыкі, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацыянальнага банка Анатоль МАРОЗ**. — Расійская Федэрацыя са свайго боку запатрабавала праграму мер па выхадзе з крызісу. Літаральна на наступным тыдні або ў пачатку мая гэта пытанне павінна вырашыцца, і далей будуць прымацца крокі па стабілізацыі валютнага рынку Беларусі. Будзе разглядацца і пытанне аб збліжэнні курсаў, выхад на адзіны курс».

Ажыятаж на рынку наяўнасці Беларусі быў створаны самімі фізічнымі асобамі, скупка валюты якімі справакавала адмоўнае сальда для рэспублікі і станоўчае для насельніцтва. Так, на працягу мінулага года насельніцтва набыло 1,5 млрд долараў, прычым больш за 1 млрд — толькі за тры месяцы, а менавіта з кастрычніка па снежань. Ажыятажны попыт на валюту быў абумоўлены ў тым ліку пэўнымі зменамі на знешнім рынку, у прыватнасці, ва Украіне. У студзені гэтага года сітуацыя нібыта стабілізавалася: насельніцтву было прададзена каля 50 млн долараў, а ў лютым — 12 млн. Аднак у сакавіку гэтая лічба дасягнула 700 млн долараў. Таму 22 сакавіка ўпраўленне Нацбанка прымае рашэнне не траціць золатавалютныя рэзервы, якія забяспечваюць эканамічную бяспеку краіны, на падтрыманне банкаў для продажу насельніцтву валюты. Банкі пачалі дзейнічаць паводле іншай схемы: колькі яны набывалі ў насельніцтва, столькі маглі і прадаваць. На ажыятаж гэта не паўплывала, пра што яскрава пачалі сведчыць чэргі ля кожнага абменнага пункта, але дзяржава захавала золатавалютныя рэзервы. Значна ўскладніла сітуацыю і тое, што насельніцтва пачало актыўна здымаць валютныя ўклады і разам з новай набытай валютай захоўваць у банкаўскіх ячэйках (на сёння ў банках занятыя ўсе такія ячэйкі), што раўназначна, па сутнасці, захоўванню «ў панчохах». З той толькі розніцай, што ячэйкі адназначна больш надзейныя. Валюта такім чынам «выпала» з банкаўскай сферы.

Паводле слоў **першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Віктара СЯНЬКО**, набываць валюту неабходна толькі ў абменных пунктах, паколькі выявіць сапраўднасць банкнот можа толькі банк. Акрамя таго, ніхто не адмяняў пакарання за незаконныя валютныя аперацыі. Толькі за дваццаць дзён красавіка супрацоўнікамі органаў унутраных спраў складзена 118 адміністрацыйных пратаколаў у дачыненні да асобаў, якія займаюцца незаконнымі валютнымі аперацыямі. Дарэчы, гэта толькі пратаколы, складзеныя ў дачыненні да валютчыкаў, а не да прадпрымальнікаў, якія рэалізуюць тавар за валюту, хоць гэта таксама з'яўляецца парушэннем і караецца па законе. У валютчыкаў былі канфіскаваныя грашовыя сродкі ў суме, эквівалентнай 300 млн беларускіх рублёў. У дачыненні да асобаў, якія сістэматычна займаліся незаконнымі валютнымі аперацыямі і атрымалі даход у буйным памеры, заведзены тры крымінальныя справы. Так, у гэтым месяцы па матэрыялах органаў унутраных спраў заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 46-гадовага магіляўчаніна, які са жніўня 2010 года па сакавік гэтага ажыццяўляў незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з валютна-абменнымі аперацыямі, і атрымаў даход у памеры 76 млн рублёў. Санкцыя дадзенага артыкула Крымінальнага кодэкса (незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць) прадугледжвае ад штрафу да пазбаўлення волі тэрмінам да 3 гадоў.

А ў Баранавічах махлярка пад прапановай продажу долараў авалодала больш як 900 тыс. рублёў мясцовай пенсіянеркі. 74-гадовая жанчына паведаміла міліцыі, што ў той дзень яна прыйшла да аднаго з абменных пунктаў валюты, дзе збіралася набыць долары. Да яе падышла невядомая жанчына, прапанавала валюту і паказала 300 долараў ЗША. Пакуль пенсіянерка даставала з сумкі 936 тыс. рублёў, махлярка замяніла банкноты, згорнутымі аддала жанчыне, узяла рублі і знікла. Пенсіянерка вырашыла праверыць у абменным пункце, ці не фальшывыя долары ёй прадалі, разгарнула скрутак і пабачыла ўсяго сем долараў. Па факце заведзена крымінальная справа.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

СТРАВИТА
РЕСПУБЛИКАНСКОЕ ДОЧЕРНЕЕ УНИТАРНОЕ СТРАХОВОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 год
## республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «СТРАВИТА»

*220037, г. Минск, пер. Козлова, 7, тел./факс: (8 017) 245 16 99, УНП 806000046*

тыс. руб.

| АКТИВ | СУММА | ПАССИВ | СУММА |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства (по остаточной стоимости) | 11 526 067,0 | Уставный фонд | 11 049 401,4 |
| Нематериальные активы (по остаточной стоимости) | 135 882,3 | Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | - |
| Доходные вложения в материальные ценности (по остаточной стоимости) | - | Резервный фонд | 249 345,5 |
| Вложения во внеоборотные активы | - | Добавочный фонд | 12 749 623,1 |
| В том числе: незавершенное строительство | - | Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | - |
| Прочие внеоборотные активы | - | Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 2 973 616,5 |
| Запасы и затраты | 1 182 462,4 | Целевое финансирование | - |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 641 944,7 | Доходы будущих периодов | 27 753,2 |
| расходы будущих периодов | 540 517,7 | Страховые резервы и фонды – всего | 165 929 745,0 |
| прочие запасы и затраты | - | В том числе: страховые резервы | 1 658 517 583,3 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | - | фонды предупредительных (превентивных) мероприятий, гарантийные и иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 77 986,7 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 65 361,1 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 1 523 583,5 | Долгосрочные кредиты и займы | - |
| | | Прочие долгосрочные обязательства | - |
| Расчеты с учредителями | - | Краткосрочные кредиты и займы | - |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | - | Кредиторская задолженность – всего | 381 508,7 |
| Денежные средства | 182 508 284,1 | Задолженность перед участниками (учредителями) | - |
| Финансовые вложения | 4 742 226,2 | Резервы предстоящих расходов | - |
| Прочие оборотные активы | 139,6 | Прочие краткосрочные обязательства | 8 323 012,8 |
| **БАЛАНС** | **201 684 006,2** | **БАЛАНС** | **201 684 006,2** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2010 год
## республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «СТРАВИТА»

тыс. руб.

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | |
| Страховые взносы (премии) полученные, брутто | 010 | 58 940 228,3 |
| Страховые выплаты | 020 | 9 241 325,1 |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –) | 030 | -51 316 555,4 |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | 668 311,4 |
| Расходы на ведение дела | 041 | 8 243 820,4 |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –) | 050 | -10 529 784,0 |
| **II. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | |
| Страховые взносы (премии) с учетом перестрахования, нетто | 064 | - |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (+ или –) | 067 | - |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования | 082 | - |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с учетом перестрахования (+ или –), нетто | 092 | - |
| Изменение других технических резервов (+ или –) | 100 | - |
| Изменение иных страховых резервов (+ или –) | 105 | - |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 110 | - |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 115 | - |
| Расходы на ведение дела | 120 | - |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 122 | - |
| Поступления, связанные с реализацией перешедшего к страховщику права требования страхователя (выгодоприобретателя) к лицу, ответственному за убытки, возмещенные в результате страхования | 125 | - |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или –) | 130 | - |
| **III. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Операционные доходы | 140 | 22 859 886,7 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 141 | 1,7 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 150 | 22 859 885,0 |
| Операционные расходы | 160 | 41 472,2 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 170 | 22 818 412,8 |
| **IV. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Внереализационные доходы | 180 | 1 989 023,6 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 181 | 9 525,4 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 190 | 1 979 498,2 |
| Внереализационные расходы | 200 | 2 293 021,3 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 210 | -313 523,1 |
| Прибыль (убыток) | 220 | 11 975 105,7 |
| Налог на прибыль | 260 | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 270 | 128 439,8 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 280 | 22 810,8 |
| Чистая прибыль (убыток) | 300 | 11 823 855,1 |

**Руководитель** **В.Ф. Моисеенко**
**Главный бухгалтер** **И.Е. Валаханович**

Достоверность годового баланса и отчета о финансовых результатах РДУСП «Стравита» за 2010 год подтверждена заключением аудиторской организации ОДО «Промаудит» (специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495307 от 19.12.2008 г. выдано Министерством финансов Республики Беларусь и действительно до 02.02.2014 г.).

**Заключение аудиторской организации ОДО «Промаудит»:**

«…По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность РДУСП «Стравита», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение РДУСП «Стравита» на 1 января 2011 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год, при этом совершенные РДУСП «Стравита» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству».

22.02.2011 г.

**Директор ОДО «Промаудит»** **А.В. Анисович**
**Аудитор, возглавлявший аудит** **И.А. Бич**

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 23.04.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 048,00 | 1 чэшская крона | 183,99 |
| ▼ 1 еўра | 4 443,98 | 1 польскі злоты | 1 122,78 |
| 1 латвійскі лат | 6 255,52 | ▲ 1 расійскі рубель | 109,09 |
| 1 літоўскі літ | 1 285,13 | 1 украінская грыўня | 382,55 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 27,9396 |
| 10 UAH | 35,0670 |
| 10000 BYR | 91,7557 |
| EUR | 40,7443 |

Агенства Уладзімра Грачова

## У БЕЛАРУСІ З 1 ЛІПЕНЯ ПАШЫРАЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ АТРЫМАННЯ АДНАРАЗОВЫХ СУБСІДЫЙ НА ЖЫЛЛЁ

**Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка 22 красавіка падпісаў указ № 172, якім уносяцца змяненні і дапаўненні ў некаторыя ўказы кіраўніка дзяржавы.**

Дакумент накіраваны на далейшае ўдасканаленне ўмоў і механізму аказання дзяржаўнай падтрымкі грамадзянам пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў, а таксама парадку прадастаўлення і выкарыстання службовых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Указам пашыраюцца магчымасці атрымання аднаразовых субсідый для маладых сем'яў, а таксама грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у сельскай мясцовасці, не маюць пазачарговага права на прадастаўленне аднаразовых субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Гэтым катэгорыям грамадзян выплата аднаразовых субсідый на пагашэнне запазычанасці па льготным крэдыце будзе праводзіцца не ў працэсе будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання), а пасля ўводу дома ў эксплуатацыю (набыцця жылога памяшкання) роўнымі долямі ў тэрміны, установленыя крэдытным дагаворам. Гэта дасць магчымасць пашырыць колькасць атрымальнікаў гэтай дзяржаўнай падтрымкі.

Дакументам здымаецца абмежаванне тэрміну звароту грамадзян (пры наяўнасці ўстаноўленых заканадаўствам падстаў) на перадачу ва ўласнасць на платнай аснове ў адпаведнасці з законам «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, прадастаўленых ім ва ўстаноўленым парадку да 8 красавіка 2006 года. Разам з тым службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, прадастаўленыя пасля 8 красавіка 2006 года, па-ранейшаму не будуць падлягаць выключэнню са складу службовых і прыватызацыі.

Указам прадугледжваецца магчымасць аплаты кошту перадаваемых службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ў растэрміноўку на 20 гадоў пры ўмове ўнясення першапачатковага ўзносу ў памеры не менш як 10 працэнтаў іх кошту. Указ уступае ў сілу з 1 ліпеня 2011 года.

## БЕЛАРУСЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ БОЛЬШ ПАТРАБАВАЛЬНЫМІ ДА СЯБЕ

Такое меркаванне карэспандэнту БЕЛТА выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч, каментуючы Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.

Дэпутат падкрэсліў, што ў звароце кіраўніка дзяржавы размова ішла пра самае важнае для людзей — бяспеку жыцця. Гэта паняцце шматграннае і ўключае ў сябе, напрыклад, эканамічную, энергетычную, дэмаграфічную бяспеку.

Уладзімір Здановіч звярнуў увагу, што асаблівую ролю ў пасланні Прэзідэнт надаў пытанням забеспячэння фінансава-эканамічнай бяспекі. «Яна базіруецца на трох прынцыпах: інавацыях, інвестыцыях, ініцыятыве. А над усімі імі вяршэнствуе патрабаванне жыць па сродках», — адзначыў дэпутат.

Залогам забеспячэння ў Беларусі энергетычнай бяспекі, на думку парламентарыя, з'яўляецца будаўніцтва АЭС. «У пасланні была выкладзена пазіцыя кіраўніка дзяржавы аб неабходнасці будаўніцтва ў краіне АЭС, якая супадае з меркаваннем большасці людзей», — сказаў Уладзімір Здановіч.

«Кожны чалавек, які глядзеў і слухаў пасланне, ад школьніка да міністра, павінен быў зрабіць наступны вывад: жыццё чалавека і жыццё дзяржавы неаддзельныя адно ад аднаго, і жыццё гэта вельмі далікатнае. Каб захаваць яго і зрабіць яшчэ лепшым, неабходна максімальна ўзмацніць патрабаванні да саміх сябе», — рэзюмаваў парламентарый.

## БОЛЬШ ДЗІЦЯЧЫХ САДКОЎ У РАЙЦЭНТРЫ І АГРАГАРАДКАХ

**Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар МАКАРЭВІЧ** сказаў, што з асаблівай увагай яго калегі-дэпутаты вывучалі ў пасланні Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі раздзелы, звязаныя з сацыяльнай палітыкай.

— Прэзідэнт указаў на тое, што задача дзяржавы — стварыць умовы для сям'і, каб у ёй было камфортна выхоўваць дваіх і больш дзяцей, — разважае Віктар Мікалаевіч, — і далей: «У Беларусі будуецца шмат жылля, але трэба прадугледзець, каб дзіцячыя садкі былі побач з домам. Гэты аспект трэба разглядаць як частку комплекснага вырашэння дэмаграфічнай праблемы».

У нашым райцэнтры, як справядліва заўважыў кіраўнік дзяржавы, няма сёння чаргі на жыллё. І ўсё таму, што за апошнія паўтара-два гады ў гэтай галіне здзейснены сапраўдны прарыў. За кароткі час у Пружанах выросла дзевяць камфортных і прыгожых пяціпавярховак. І ўпершыню сёлета адзелам адукацыі зафіксавана чарга на месцы ў дзіцячы садок. Зараз у раёне разглядаецца пытанне аб будаўніцтве новага дзіцячага сада ў новым мікрараёне. І хоць з грашыма ў бюджэце не вельмі густа, будаваць давядзецца. Нікуды мы ад гэтага недзенемся. Нараджальнасць у горадзе хоць невялікімі тэмпамі, але расце. І гэтыя працэсы трэба ўсяляк падтрымліваць, у тым ліку і месцамі ў дзіцячых дашкольных установах недалёка ад дому.

Садкамі павінны быць ахоплены і дзеці з сельскай мясцовасці. Ва ўсіх аграгарадках раёна такія ўстановы ў нас працуюць. А ў аграгарадку пасёлка Лінова вядзецца будаўніцтва новага садка, бо стары аказаўся малы для той колькасці дзяцей, якія ёсць. Пасёлак развіваецца, маладыя сем'і будуюць жыллё. Значыць, у населенага пункта ёсць перспектыва, якую неабходна падтрымліваць сацыяльнай інфраструктурай.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ПАТРЫЯРХА МАСКОЎСКАГА І ЎСЯЕ РУСІ КІРЫЛА З ВЯЛІКАДНЕМ

«Уваскрасенне Хрыстова напаўняе сэрцы людзей самымі добрымі надзеямі, верай у лепшае. Прыемна ўсведамляць, што вялікае свята стала сапраўды ўсеагульным і дорыць любоў і цяпло кожнаму, — гаворыцца ў віншаванні. — Вялікдзень — гэта сапраўды перамога дабра над злом. І няхай гэта перамога прынясе радасць Вам, нашым народам, Праваслаўнай Царкве і ўсяму свету».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Патрыярху Кірылу за духоўную падтрымку ў цяжкі для Беларусі час і за малітвы аб беларускім народзе.

## ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ ПРЫВІТАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАМ ДЗЯСЯТАГА МАСКОЎСКАГА ВЕЛІКОДНАГА ФЕСТЫВАЛЮ Ў СУВЯЗІ З ЯГО АДКРЫЦЦЁМ

У прывітанні, у прыватнасці, адзначаецца, што за мінулыя гады гэта свята мастацтваў ператварылася ў адзін з самых маштабных і аўтарытэтных творчых форумаў сучаснасці.

«Прыемна адзначыць, што сёлета мерапрыемствы фестывалю праходзяць і на беларускай зямлі. Не сумняваюся, што яго добрыя традыцыі будуць і далей развівацца і мацнець, садзейнічаючы пашырэнню плённага супрацоўніцтва паміж нашымі брацкімі народамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ЛІЧЫЦЬ СПРАВЯДЛІВАЙ КРЫТЫКУ ПРЭЗІДЭНТА Ў АДРАС УРАДА

**Аб гэтым кіраўнік урада заявіў учора на пасяджэнні Саўміна, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Учора Прэзідэнт цалкам справядліва крытыкаваў урад за разварушванне ў рабоце, за марудныя рашэнні, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — І сапраўды, важнейшыя пытанні не патрабуюць такога працяглага часу, які мы з вамі затрачваем на прыняцце адпаведных кіраўніцкіх рашэнняў».

У сувязі з гэтым ён запатрабаваў ад усіх членаў урада зрабіць вывады з крытыкі Прэзідэнта і прыняць неадкладныя меры па паляпшэнні стану спраў.

Пры гэтым прэм'ер-міністр дадаў, што ад урада чакаюць практычнай работы. «Трэба браць гэту задачу і вырашаць, а не разважаць», — рэзюмаваў Міхаіл Мясніковіч.

«Калі размова ідзе аб прыватызацыі, то ў нас яна аплатная, на конкурснай аснове прыватызацыя, за грошы, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Калі прадаецца дзяржаўны ці камунальны аб'ект або яго частка, гэтыя сродкі не павінны распыляцца на бягучае спажыванне, а накіроўвацца на стварэнне новых аб'ектаў дзяржаўнай і камунальнай уласнасці».

Прэм'ер-міністр адзначыў, што некаторыя часта гавораць аб раздачы ў Беларусі дзяржуласнасці. Такія размовы Міхаіл Мясніковіч лічыць неабгрунтаванымі. «Ніякай раздачы дзяржуласнасці ў Беларусі не было і не будзе, — сказаў ён. — Я даў даручэнне старшыні Дзяржкамаймасці разглядаць гэта пытанне з аблвыканкамамі комплексна».

Кіраўнік урада выказаў заклапочанасць работай па прыцягненні прамых замежных інвестыцый у Віцебскай вобласці, а таксама падкрэсліў, што няма зладжанасці ў гэтай рабоце таксама ў Брэсцкага, Гомельскага аблвыканкамаў і Мінска. «З боку шэрагу кіраўнікоў абласцей чарговы раз узнімаліся пытанні няўзгодненасці рэгіянальнага і галіновага ўзроўняў, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Я гэта расцэньваю як пэўную бездапаможнасць Міністэрства эканомікі і камітэтаў эканомікі адпаведных аблвыканкамаў». Паводле слоў прэм'ер-міністра, усе гэтыя пытанні павінны былі быць узгоднены яшчэ ў мінулым годзе.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на тое, што вялікую заклапочанасць выклікае таксама работа па прыцягненні прамых замежных інвестыцый, праводзімая прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці. «Інвестыцыі скарачаліся амаль напалавіну, замежных крыніц практычна няма і не праглядаецца», — канстатаваў ён. Падобная сітуацыя склалася і на прадпрыемствах канцэрна «Белбіяфарм». Ім даведзены невялікія, «нават маленькія» заданні па прыцягненні замежных інвестыцый, але нават гэтыя аб'ёмы не выконваюцца. «У вельмі цяжкім становішчы знаходзяцца энергетычныя будоўлі, на плануемыя аб'ёмы гэтага года не хапае каля трэці рэальных крыніц фінансавання», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

У існуючай сітуацыі ён запатрабаваў ад міністэрстваў, перш за ўсё Мінэканомікі, адкрытай размовы па названых праблемах. «Гэта павінна быць адкрытая размова, а не стогны аб тым, што нешта не ўдалося», — сказаў ён, пры гэтым адзначыўшы, што прапановы павінны быць канкрэтнымі.

Аналізуючы развіццё інвестыцыйнай дзейнасці ў Беларусі, Міхаіл Мясніковіч дадаў, што не трэба забываць аб тым, што цяпер рыхтуецца новая рэдакцыя інвестыцыйнага кодэкса. Кіраўнік урада раскрытыкаваў тэмпы распрацоўкі дакументаў, падкрэсліўшы, што яны вельмі марудныя. «Усе тэрміны, магчымыя і немагчымыя, правалены, аналагічная сітуацыя і са стратэгіяй работы па прыцягненні прамых замежных інвестыцый», — дадаў ён.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што доля інвестыцый у машыны і абсталяванне ў структуры інвестпартфеля вырасла зусім нязначна — да 38 працэнтаў, у той час як задача ставілася, каб гэты паказчык перавышаў 50 працэнтаў.

«Трэба пераходзіць да адшукання ў тым ліку нетрадыцыйных крыніц фінансавання і крыніц крэдытавання, а не толькі ісці па самым простым шляху — вы дайце нам гарантаваную крыніцу, дайце адпаведныя гарантыі ўрада, а некаторыя кіраўнікі просяць яшчэ і гарантыі аблвыканкамаў, а мы можа выканаем, а можа і не выканаем (інвестпраекты. — Заўвага БЕЛТА). Такога быць не павінна», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, такія выпадкі павінны быць выкараненыз практыкі. «Трэба не разважаць, а выконваць заданні», — падкрэсліў кіраўнік урада. Пры гэтым ён нагадаў, што губернатары адказваюць у гэтым выпадку за тэрыторыю і ўсё, што на ёй, міністр — за від дзейнасці, а дырэктар — за сваё прадпрыемства.

Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў ад міністэрстваў і мясцовых органаў улады больш актыўна працаваць з інвестарамі, знаходзіць альтэрнатыўныя крыніцы фінансавання інвестыцыйных праектаў. «Працуйце з інвестарамі, размяшчайце IPO і іншыя сучасныя механізмы інвестыцыйнай дзейнасці», — сказаў ён.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што інвестыцыі — гэта развіццё, а развіццё — гэта будучае. «Вырашаючы важнейшыя пытанні бягучай дзейнасці, мы павінны думаць, якой будзе эканоміка праз 5, 10, 15 гадоў. А гэта закладваецца сёння ў тых планах інвестыцыйнай дзейнасці, якія абмяркоўваюцца, тых заданнях, якія сфармуляваны ў адпаведных дакументах, на што неаднаразова ўказваў і кіраўнік дзяржавы», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што дасведчанасць кадраў, кожнага міністра, кіраўніка прадпрыемства будзе разглядацца ў тым ліку праз прызму вырашэння пытанняў інвестыцыйнага развіцця і нарошчвання экспарту.

Прэм'ер-міністр дадаў, што ў інвестыцыйнай палітыцы існуе тры галоўныя пытанні — эфектыўнасць, г.зн. аддача інвестпраектаў, структура інвестыцыйнага партфеля і крыніцы фінансавання. «Па ўсіх складальніках ёсць поўная зразумеласць, поўная вызначанасць, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Наш прыярытэт — экспартаарыентаваныя і імпартазамяшчальныя праекты, г.зн. тое, што працуе на валютныя рэсурсы». Прэм'ер-міністр нагадаў, што доля замежных крыніц у інвестыцыйным партфелі павінна складаць не менш як 21 працэнт.

Аб'ём прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове, прыцягнутых у эканоміку Беларусі ў першым квартале гэтага года, склаў крыху больш за 1 працэнт ад гадавога задання. Аб гэтым заявіў на пасяджэнні Саўміна прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Кіраўнік урада падкрэсліў, што выкананне ў краіне задання па прыцягненні прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове ў першым квартале наогул не паддаецца крытыцы. «Стан спраў не вытрымлівае ніякай крытыкі, — сказаў ён. — Мы з вамі так спрацавалі, што за квартал прыцягнулі крыху больш за 1 працэнт гадавога задання прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове».

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у цэлым у першым квартале «паказаны добрыя тэмпы па інвестыцыях, аднак яны падманлівыя». «Тыя 125 працэнтаў, якія мы маем па першым квартале, выраслі ад нізкай мінулагодняй базы — 97,4 працэнта да ўзроўню 2009 года», — канстатаваў ён.

Шэраг міністэрстваў як у гэтым годзе, так і раней не стварылі адпаведную рэсурсную базу, не прыцягнулі інвестараў. У сувязі з гэтым выкананне гадавых заданняў па прыцягненні інвестыцый, перш за ўсё прамых замежных, выклікае ў Міхаіла Мясніковіча вялікія сумненні.

Не дабіраюць па гэтых паказчыках Мінпрам, Мінсельгасхарч, канцэрны «Белбіяфарм» і «Беллегпрам», Віцебскі аблвыканкам і Мінгарвыканкам. У той жа час, паводле даных прэм'ер-міністра, за першы квартал у Беларусь паступіла каля 280 прапаноў ад замежных інвестараў на агульную суму $9,5 млрд. Нават калі б кожнае пятае з іх было вартым увагі, мы выйшлі б на тыя $2 млрд, пытанне па якіх павінны былі вырашыць у першым квартале, сказаў кіраўнік урада.

Міхаіл Мясніковіч дадаў, што многія аблвыканкамы, у тым ліку Гродзенскі, маюць сур'ёзныя, няхай пакуль і контурныя, напрацоўкі ў інвестсферы. Аднак калі адпаведным чынам іх развіць і падмацаваць гарантыямі, гэта могуць быць значныя прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове ў эканоміку краіны.

Гаворачы аб акупнасці інвестпраектаў з удзелам замежных крэдытных ліній, прэм'ер-міністр нагадаў, што міністры і кіраўнікі прадпрыемстваў нясуць адказнасць за гэтыя крэдыты. «Вы несяце адказнасць без усялякага тэрміну даўнасці, не разлічвайце на тое, што гэтыя крэдытныя лініі будзе перакрываць дзяржава і разлічвацца па чыіхсьці абавязацельствах — гэта трэба выкінуць з галавы. Такіх сродкаў проста няма і быць не можа», — падкрэсліў ён.

Прэм'ер-міністр таксама дадаў, што крэдыты банкаў — гэта не эмісійныя крыніцы. «Калі мы некалькі тыдняў таму ўдакладнілі крыніцы крэдытавання, некаторымі членамі ўрада гэта трактавалася як невыкананне або магчымае невыкананне праграм і праектаў, якія вызначаны IV Усебеларускім народным сходам, адпаведнымі рашэннямі кіраўніка дзяржавы і зацверджаны праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011—2015 гады, — расказаў Міхаіл Мясніковіч. — Усе праграмы і рашэнні з'езда трэба выконваць».

## АЛЯКСЕЙ МІЛЕР І УЛАДЗІМІР СЯМАШКА АБМЕРКАВАЛІ ПЫТАННІ ПАСТАВАК ГАЗУ Ў БЕЛАРУСЬ З 2012 ГОДА

У цэнтральным офісе ААТ «Газпрам» адбылася рабочая сустрэча старшыні праўлення Аляксея Мілера і першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашкі. Аб гэтым гаворыцца ў інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце ААТ «Газпрам».

Баку абмеркавалі перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва, у прыватнасці па пастаўках газу ў рэспубліку пачынаючы з 2012 года з улікам Адзінай эканамічнай прасторы, а таксама перспектывы дзейнасці ААТ «Белтрансгаз».

## Абзац

◢ 50-гадовы юбілей — у Алены Спірыдовіч, дыктара беларускага тэлебачання, заслужанай артысткі Беларусі, вядучай самых папулярных у краіне нацыянальных і міжнародных фестываляў і святаў: «Славянскага базару» ў Віцебску, «Лістапада», «Дажынак» і многіх іншых. Віншуем любімую артыстку!

◢ **Міліцыянеры палка патрульна-паставой службы УУС Віцебскага аблвыканкама селі на скутары. Учора ўпершыню патруль на мотаролерах адправіўся на дзяжурства ў парк адпачынку імя Савецкай Арміі і дачны пасёлак Уланавічы, што размешчаны непадалёк. Плануецца, што менавіта зоны адпачынку, прыгарадныя дачныя пасёлкі ў летні перыяд стануць аб'ектамі ўвагі міліцэйскіх нарадаў на скутарах. Гэта забяспечвае мабільнасць міліцыянераў і, у адрозненне ад аўтатранспарту, памяншае негатыўны ўплыў на экалогію.**

## Поўны абзац

◢ Тэрміты «абакралі» індыйскі банк. Насякомыя з'елі каля 10 млн рупій (прыкладна 222 тыс. долараў) у банкнотах, што знаходзіліся ў банкаўскіх ячэйках у філіале установе на працягу некалькіх месяцаў. Інцыдэнт адбыўся на поўначы краіны, у аддзяленні дзяржаўнага банка. Супрацоўнікі банка выявілі сляды дзейнасці тэрмітаў 20 красавіка і адразу разваніліся ў паліцыю. Тыя выехалі ў банк і зарэгістравалі псоту нацыянальнай валюты. Спецыялістам трэба высветліць, якім чынам тэрміты праніклі ў ячэйку. Раней у індыйскіх банках ужо былі падобныя выпадкі — тэрміты з'ядалі мэблю і дакументы. Да грошай у такіх буйных памерах яны дабраліся ўпершыню.

◢ **Жыхар Польшчы Томаш Урыновіч вырашыў ажаніцца з карцінай, якая яму належыць. На ёй намаляваная жанчына яго мары. Томаш сцвярджае, што не знайшоў той жанчыны ў рэальнасці, таму вырашыў заключыць шлюб з намаляванай. На словах Урыновіча, упершыню ён убачыў карціну з выявай дзяўчыны, што несла кошык з бялізнай, у 2001 годзе ў галерэі, а затым выкупіў яе. На працягу апошніх 10 гадоў 37-гадовы Урыновіч шукаў натуршчыцу ці мастака.**

**Закаханы мужчына расказаў, што хацеў бы проста пазнаёміцца з дзяўчынай, выпіць з ёй кавы і даведацца, як ёй жывецца. Аднак пошукі не мелі поспеху, і зараз Томаш мае намер ажаніцца з карцінай. Ён сцвярджае: калі гэтага нельга зрабіць у Польшчы, ён знойдзе іншае месца і даможацца свайго. Ці быў ён калі-небудзь жанаты на рэальнай жанчыне, не паведамляецца.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ДЛЯ ЖЫХАРОЎ ПАМЕЖЖА — Суседзі ПУНКТ «КЛЯВІЦА»

**У перыяд з 24 па 25 красавіка з 10 да 17 гадзін у сувязі са святкаваннем Вялікадня для перасячэння Дзяржаўнай мяжы будзе дадаткова адчынены пункт спрошчанага пропуску «Клявіца» каля вёскі Клявіца Ашмянскага раёна, паведамляе камандаванне Смаргонскай памежнай групы.**

У гэтым пункце будзе ажыццяўляцца пропуск грамадзян, якія пастаянна пражываюць на памежнай тэрыторыі. Пры сабе неабходна мець пашпарт з візай сумежнай дзяржавы.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэл. 8-01592-35883 (кругласутачна) альбо 8-01592-30080 (у рабочы час).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ШТРАФЫ ЗА ЭКАНАМІЧНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ Ў ЛІТВЕ ЎЗРАСТУЦЬ У 5 РАЗОЎ

**Парламент Літвы прыняў папраўкі да Крымінальнага кодэкса, якія шматкроць павялічваюць штрафы за эканамічныя злачынствы і кантрабанду.**

У канчатковым варыянце паправак парламент улічыў прапановы прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ павялічыць памеры штрафаў за эканамічныя злачынствы.

Цяпер, пасля ўваходжання паправак у сілу, штраф за няцяжкае эканамічнае злачынства вырасце з 3765 да 18 825 еўра, за злачынства сярэдняга цяжару — з 7 530 да 37 650 еўра, за цяжкія — з 11 295 да 56 475 еўра.

### У АРМЕНІІ АДКРЫЮЦЬ БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ СТРАЛЬБЫ

**У Арменіі будуць арганізаваны бясплатныя курсы па выкарыстанні агнястрэльнай зброі, у тым ліку снайперскай. Пра гэта паведамляе Armenia Today.**

Аўтарам гэтай ініцыятывы стаў ваенны эксперт Арцрун Аванісян. Паводле яго слоў, навучанне стральбе дазволіць умацаваць асновы ваенна-патрыятычнага выхавання — першым чынам, сярод моладзі. Эксперт адзначыў, што яго ідэя ўжо выклікала ў многіх маладых людзей, у тым ліку і ў дзяўчат, вялікі запал. Курсы пачнуцца ў канцы жніўня ці пачатку верасня. Заняткі працягнуцца некалькі тыдняў.

Нагадаем, раней, на пачатку красавіка, курсы снайперскай стральбы былі адкрыты ў Азербайджане.

### КОШТ НА КАВУ ДАСЯГНУЎ МАКСІМУМУ ЗА 34 ГАДЫ

**Кошт за фунт кавы (каля 0,45 кілаграма) перавысіў 3 долары ўпершыню за 34 гады. Пра гэта піша газета The Guardian.**

Рост цэн выкліканы неўраджаем кавы гатунку «Арабіка» і попытам на высакаякасную каву з боку сярэдняга класа ў краінах, што развіваюцца — Індыі, Кітаі, Інданэзіі і Бразіліі.

Кошты на каву ў апошнія 7 месяцаў павялічыліся ўдвая і чакаецца іх далейшы рост у сувязі са скарачэннем сусветных запасаў. Паводле паведамлення Міжнароднай Кававай Арганізацыі, запасы кавы дасягнулі 50-гадовага мінімуму. Кава на паліцах крам можа прыкметна падаражэць, адзначае The Guardian.

### БРЫТАНСКІЯ ВУЧОНЫЯ: САКРЭТ ПОСПЕХУ Ў ЖАНЧЫН УТОЕНЫ Ў БЕЗЫМЕННЫМ ПАЛЬЦУ МУЖЧЫНЫ

**Сакрэт прывабнасці мужчын у літаральным сэнсе ў іх у руках, устанавілі брытанскія навукоўцы. Для гэтага яны сфатаграфавалі 49 маладых мужчын і параўналі прапарцыйныя суадносіны паміж даўжынёй іх пальцаў з уласцівасцямі іх характару і поспехам сярод жанчын, піша The Daily Mail.**

Разам са сваімі французскімі і швейцарскімі калегамі брытанскія адмыслоўцы высветлілі: больш шанцаў сярод жанчын у тых мужчын, чый безыменны палец даўжэйшы за ўказальны. Жанчыны ж з такімі «мужчынападобнымі» рукамі адрозніваюцца агрэсіўным норавам. Насупраць, у слабахарактарных асоб даўжэйшым будзе ўказальны палец. Прычына такой з'явы, мяркуюць навукоўцы, ва ўтрыманні тэстастэрону ў арганізме, якое ўплывае і на знешні выгляд чалавека ў цэлым, і на прапорцыі яго рук у прыватнасці.

Падчас гэтага даследавання навукоўцы замяралі пальцы «паддоследных», а затым паказвалі фатаграфіі жанчынам. Тыя мужчыны, чые безыменныя пальцы былі даўжэйшыя за ўказальныя, сапраўды атрымалі больш станоўчых водгукаў у жанчын, якія палічылі, што гэтыя мужчыны больш падыходзяць як для кароткатэрміновай інтрыжкі, так і для працяглых адносін. Але поспех сярод жанчын звязаны таксама з павышанай схільнасцю да здрад. У цэлым такі мужчына — экстраверт, адрозніваецца мэтанакіраванасцю і вялікай фізічнай сілай. Поспех мае свой адваротны бок: такі аб'ём жыццёвай энергіі прыводзіць да таго, што яго носьбіты часцей за іншых трапляюць у турму, становяцца ахвярай забойства ці пацыентамі псіхіятра.

# ЛІКУЕ СЭРЦА! РАДУЕЦЦА РОЗУМ! СВЯТКУЕ ВОЛЯ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарагія браты і сёстры! Шлях ад Крыжа да Пасхі мы здзяйсняем і ў гэтым годзе. У дні Вялікага посту ў метро горада Мінска быў учынены тэрарыстычны акт. Загінулі людзі. Многія былі паранены. Але не паніка, не падазронасць і адчужэнне сталі дамінуючымі пачуццямі нашых сугарадзян. Гора аб'яднала нас, выявіла лепшыя рысы беларускага народа: спагадлівасць, міласэрнасць, жаданне дапамагчы бліжняму. Няхай гэтыя дабрадзейнасці, падобна духоўнаму шчыту, адводзяць усякую варожую стралу, якая ляціць на нашу зямлю.

Сёлета спаўняецца 25 гадоў шэсця беларускага народа крыжовым шляхам чарнобыльскай бяды. Шмат слоў сказана пра яе... Яшчэ больш перажыта сэрцамі простых людзей. Сёння сэрцы нашы зноў засмучаны з-за беспрэцэдэнтных прыродных катаклізмаў, войнаў і іншых выклікаў, з якімі сутыкаецца сучасная цывілізацыя.

Але Пасха — гэта перамога Жыцця! Гасподзь, Які ўзяў на Сябе грахі свету, сёння прасвятляе нас промнямі найсвятлейшага Уваскрасення! Таму мы адважна *спяваем, усклікаем і прамаўляем* пераможную песню:

Хрыстос уваскрэс з мёртвых, смерцю смерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыццё дараваў!

Наш Бажэственны Настаўнік перамог свет і ўручыў нам плады гэтай перамогі. Таму мы, хрысціяне, маем уладу рабіць дабро і любіць адзін аднаго! Менавіта да гэтага заклікае нас святы апостал і евангеліст Іаан Багаслоў: *«Узлюбленыя! калі так узлюбіў нас Бог, то і мы павінны любіць адзін аднаго»* (1 Ін. 4, 11).

Жыццёвая пазіцыя хрысціяніна — гэта пасхальная, дзейная любоў. Хрысціянінам называецца не той, хто пасіўна чакае ад суседа спачування. Мы самі павінны быць прыкладам стойкасці і мужнасці для бліжняга. Няхай сёння кожны струджаны і абцяжараны, гледзячы на хрысціяніна, адчуваючы лікаванне яго сэрца, пажадае далучыцца да нашай радасці. Няхай кожны паўтарае словы апостала Паўла: *«Я ўпэўнены, што ні смерць, ні жыццё, ... ні цяперашняе, ні будучае, ні вышыня, ні глыбіня, ні якое стварэнне іншае не зможа адлучыць нас ад любові Божай у Хрысце Ісусе, Госпадзе нашым»* (Рым. 8, 38-39).

Цуд любові здольны спыніць чарнобыль граху ў нашых душах, у нашых сем'ях, у нашай дарагой Бацькаўшчыне — Беларусі! Адкінем страх ад нашых сэрцаў. Бо, паводле слова Пісання: *«Дасканалая любоў праганяе страх»* (1 Ін. 4, 18). Калі мы народжаны ў гэты свет — будзем памятаць, што Бог любіць нас! Калі мы жывём у сем'ях — будзем ведаць, што мы — Царква Хрыстова! Калі мы — грамадзяне Беларусі, будзем радавацца і дзякаваць Богу за гэта! Бо мы ходзім па зямлі, дыхаем паветрам і гаворым на мове святых, якія праславілі месца гэтае перад Абліччам Божым!

Сіла Уваскрэслага Бога дзейнічае праз стагоддзі. Яна жыватворыць Царкву, а разам з Ёю ўсё грамадства, і ў нашы дні. Пад уплывам гэтай сілы нядаўна адбыўся Архіерэйскі Сабор Рускай Праваслаўнай Царквы, які прыняў важныя рашэнні ў галіне ўнутранай і знешняй дзейнасці Маці-Царквы. У гэтыя пасхальныя дні я звяртаюся да ўсіх вернікаў Беларускай Праваслаўнай Царквы з заклікам — словам і справаю садзейнічаць іх ажыццяўленню.

Дарагія браты і сёстры! Радасна святкуючы сёння Уваскрасенне Хрыстова і дасылаючы адзін аднаму радасныя пасхальныя вітанні, мы сведчым усім аб спасенні свету, якое дадзена нам у Хрысце. Як Гасподзь, раздзяляючы, прымножыў пяць хлябоў і насыціў імі пяць тысяч чалавек, так і мы пакліканы падзяляць сваю радасць з бліжнім і праз гэта — прымнажаць яе, каб ніхто не застаўся галодным і засмяглым.

Вітаю і віншую з Хрыстовай Пасхай усіх беларусаў, што жывуць у рассеянні. Мы аддаленыя адзін ад аднаго прастораю, але ў гэтыя дні нашы сэрцы з'яднаныя. Бо Хрыстос рукі распасцёр на Крыжы, каб сабраць раскіданых і явіць адзінства чалавечага роду Сваім слаўным Уваскрасеннем!

У гэты дзень, *«які стварыў Гасподзь»* (Пс. 117, 24), жадаю ўсім вернікам Беларускай Праваслаўнай Царквы шчодрых благадатных дароў ад Уваскрэслага Госпада нашага Ісуса Хрыста! Будзем кіраваць жыццесцвярджальным заклікам апостала Паўла: *«Радуйцеся, удасканальвайцеся, суцяшайцеся, будзьце аднадумнымі, мірнымі, — і Бог любові і міру няхай будзе з вамі»* (2 Кар. 13, 11).

***ХРЫСТОС УВАСКРЭС! САПРАЎДЫ ЎВАСКРЭС ХРЫСТОС!***

**ФІЛАРЭТ, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

# УВАСКРОСЛЫ ХРЫСТУС — НАДЗЕЯ СУЧАСНАГА СВЕТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адносна гэтай ідэі шатландскі пісьменнік Томас Карлейль сказаў наступнае: каб гэта сталася, табе трэба прамаўляць так, як да гэтага ніхто і ніколі не прамаўляў, і жыць так, як да гэтага ніхто і ніколі не жыў, а потым ты павінен быць укрыжаваны, затым уваскрэснуць на трэці дзень і пераканаць свет, што ты яшчэ жывеш. Толькі тады твая рэлігія будзе мець шанц.

Уваскрасенне Езуса Хрыста з'яўляецца надзеяй нашага ўваскрашэння. Чалавецтва, нягледзячы на імклівае развіццё навукі і яе вялікія дасягненні, тым не менш ведае, што існуе пераход толькі ў адным напрамку, без вяртання назад. Аднак факт уваскрасення Хрыста становіцца адзіным і выключным фактам у гісторыі: знаходзячыся ў грабніцы, Езус падрыхтаваў сабе шлях вяртання да жыцця. І не толькі сабе, але і іншым. Ён сказаў: «Хто верыць у Сына, мае жыццё вечнае» (Ян 3, 36). Таму дарам уваскрослага Езуса з'яўляецца наша будучыня.

Такім чынам, мы бачым, што ўваскрасенне Хрыста з'яўляецца актам бязмежнай Божай міласэрнасці. Аб гэтым мы павінны памятаць асабліва, бо праз тыдзень у Рыме адбудзецца беатыфікацыя Слугі Божага Яна Паўла II — Апостала Божай міласэрнасці. Аб гэтым трэба памятаць і таму, што дваццаць гадоў таму, 13 красавіка 1991 г., менавіта Ян Павел II адрадзіў іерархічныя структуры Каталіцкага Касцёла ў Беларусі і ўстанавіў Мінска-Магілёўскую мітраполію.

Вялікі Пантыфік выдатна чытаў знакі часу і адказваў на іх выклікі. Зняволены ганеннямі, Касцёл у Беларусі быў як быццам у грабніцы. Ён не меў адпаведных касцёльных структур і іерархіі. Здавалася, што ён уж

# «У БОЖЫНЕ БОГ ЖЫВЕ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Бог не пашкадаваў для божынцаў і навакольнай прыгажосці, вызначыў для іх месца на самым лепшым беразе Бярэзіны. А каб жыхары былі ўдзячнымі за гэта і маліліся, паспрыяў, каб у 1777 годзе тут з'явілася царква. Узвёў яе як уніяцкі храм багаты чалавек — Валовіч. Усе святары, якім давялося несці службу ў Божыне, спраўна вялі царкоўныя ведамасці, і менавіта з іх мясцовы краязнаўца Адам Папруга даведаўся, якія раней былі прозвішчы: Галецкія, Бушкевічы, Кухаронкі, Патурэмскія, Стрыжко, Алесіёнкі, Бразінскія, Мялешкі, Грыгарэвічы, Харлановічы, Дубоўскія, Поварыі Папругі. Больш за 200 гадоў таму з'явілася тут свая школа, якая пазней стала духоўным вучылішчам. Вёска сапраўды апраўдвала незвычайную духоўна-рэлігійную назву. Але ці доўга гэтак было? Адам Папруга, капаючыся ў архівах болей за два гады, знайшоў справаздачу расійскіх картографаў, якія абмервалі беларускія землі для інвентарызацыі пасля адмены прыгоннага права: «землі тут бедныя, людзі шмат п'юць і малаверуючыя». Пра паходжанне свайго прозвішча краязнавец даведаўся вось што. Некалі з суседняй вёскі Капланцы ў Божына на добрага сабаку абмянялі падлетка Марка Папругу. Ад яго пазней і пайшлі божынскія Папругі.

— Я працаваў у розных архівах, быў нават у Вільні, — Адам Мікалаевіч дастае з шафы таўсценны стос папер і ксеракопій з унікальнымі знаходкамі. — Асабліва ўсё гэта спатрэбілася, калі вярталі вёсцы яе гістарычную назву.

Але божынскаму 80-гадоваму гісторыку-аматару і без архіваў шмат чаго вядома. Ён сам — частка гісторыі, яе носьбіт. Нарадзіўся ў 1930 годзе — праз год пасля ўтварэння першага калгаса. Памятае, як мясцовыя людзі гналі смалу-жывіцу, наймаліся калоць камяні, працавалі плытагонамі. І, падобна да бурлакоў, цягалі вяроўкамі па Бярэзіне баржы.

— Не забуду, як па рацэ хадзілі два параходы: «Янка Купала» і «Якуб Колас». Час быў галодны. Мы беглі па беразе за параходам і крычалі: «Дзядзька Каласок, кінь хлеба кусок!»

Вайну Адам Папруга памятае тым больш. Кажа, што немцы прыйшлі ў Божына 3 ліпеня 1941 года і ўцякалі з вёскі таксама 3 ліпеня, толькі ў сорак чацвёртым. У той дзень, калі немцы прыйшлі ў Божына, было горача, і салдаты пабеглі на бярэзінскі бераж покупацца. І адзін з тых салдатаў патануў. Быў дужа вялікі шухер.

Папаласкаць бялізну ў пойменнай вадзіцы перад вялікім святам — старажытная традыцыя божынскіх гаспадынь.

Вясковы краязнавец Адам ПАПРУГА даследуе пахаванні колішняга святара САЛАЎЁВІЧА і ягонай жонкі Ганны.

Кулічы з бярэзінскай пякарні прывёз у Божына экспедытар Аляксандр МАКАРЭВІЧ, а прадае іх вяскоўцам паважаная ўсімі Наталля СМОЛЯК.

Маленькай Кацярыне ЯКІМОВІЧ радыя ўсе жыхары — у вёсцы даўно не было чуваць немаўлят.

Сын святара Павел ЮРЫКАЎ выконвае ў царкве абавязкі званара.

Хто б сумняваўся, што Божына Богам пацалаваная. Прыкладаў таму — колькі хочаш. Напрыклад, у часы сталінскіх рэпрэсій тут загінула толькі тры чалавекі (адзін з іх святар Герасімовіч). А з вайны не вярнулася 17 чалавек. Усяго ж перад пачаткам вайны у вёсцы было 350 жыхароў. І сама вёска ацалела, не згарэла, як іншыя, хоць партызаны ў Божыне бывалі часта, і гэта было першай падставай для катаванняў насельніцтва.

Адам Папруга, як выйшаў на пенсію, вярнуўся на сталае жыццё ў свой, як ён кажа, Божын — менавіта такая назва траплялася яму ў летапісах. Па прафесіі ён распрацоўшчык тарфяных радовішчаў. Мае дыплом мінскага палітэхнікума і ўкраінскага інстытута інжынераў воднай гаспадаркі, шмат гадоў адпрацаваў у паліўнай прамысловасці. Некалькі разоў быў на паслядыпломных удасканальваннях. Паходжанне назвы вёскі і яе невядомая гісторыя не давалі яму спакою. Тым больш карцела вярнуць назву Божына, бо з 1964 года вёска называлася Прырэчча.

— У хрушчоўскім 1964-м адным Указам Вярхоўнага Савета БССР было перайменавана 307 беларускіх вёсак. У тым ліку і наша Божына, — прыгадвае нялепшыя часы Адам Мікалаевіч.

Менавіта з гэтым перыядам звязана і ганебная гісторыя знішчэння старой царквы. У вайну не згарэла, дык старшыня калгаса прыгнаў трактары і расцягнуў храм цапамі. Потым дровамі гэтымі палілі на ферме.

У Беларусі ўжо быў прыклад вяртання старажытнай назвы — вёска Магільна Уздзенскага раёна, якая пры Саветах была Нёманам. Адам параіўся з аднавяскоўцамі і таксама ўзяўся за вяртанне назвы. Сабраў подпісы, прыклаў адшуканыя ў архіўных сховішчах звесткі, і ў 1991 годзе перадаў у Вярхоўны Савет. Справа разглядалася нядоўга. Назву вярнулі. І за гэта божынцы вельмі паважаюць Папругу.

А пазней у вёсцы з'явіўся малады святар з Расіі Валерый Юрыкаў. Будынак старой крамы ён перарабіў у праваслаўную царкву. Рэлігійнае жыццё пачало вяртацца ў старое рэчышча, нягледзячы на тое, што ў вёсцы засталося не больш за паўсотню жыхароў.

Хто яны — сённяшнія божынскія прыхаджане? Амаль усе — пенсіянеры. Ёсць сярод іх і дачнікі, бо сучаснае Божына больш нагадвае дачнае месца (уздоўж ракі ўзводзяцца сапраўдныя палацы). Жывуць тры сям'і чарнобыльскіх перасяленцаў. Самая маленькая прыхаджанка — пяцімесячная Кацярына Якімовіч. З надыходам лета айцец Валерый будзе хрысціць яе ў вясковым храме прарока Іллі. А цяпер усе вяскоўцы — хрышчаныя і няхрышчаныя — рыхтуюцца да Вялікадня.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*Бярэзінскі раён.*

# У «Доме афіцэраў» змяніўся «генерал»

**Віцэ-прэм'ер Сяргей РУМАС узначаліў федэрацыю футбола**

У федэрацыі футбола, якую не без іроніі называюць «Домам афіцэраў», перамены: віцэ-прэм'ер Сяргей Румас абраны 22 красавіка на пасаду старшыні. Генадзь Нявыглас, які займаў яе восем гадоў, склаў свае паўнамоцтвы, ён абраны ганаровым старшынёй. Гэта адбылося на справаздачна-выбарчай канферэнцыі АБФФ, на якой прысутнічалі і прадстаўнікі міжнароднага футбола — спецыяльны прадстаўнік ФІФА Ева Паскье і член выканкама УЕФА, старшыня Нацыянальнай асацыяцыі футбола Украіны Рыгор Суркіс.

**Генадзь НЯВЫГЛАС: «Не сорамна сыходзіць»**

Гэта ў Кіеве можна сустрэць біг-борды з надпісамі «Суркіса — у адстаўку». У нас жа такое і ўявіць складана, тым больш такіх настрояў у заўзятарскім асяроддзі масава не назіраецца. Тым не менш Генадзь Нявыглас не выстаўляў сваёй кандыдатуры на выбары на гэты раз, і першай прычынай назваў той факт, што ён трапіў у спісы невыязных. Аднак вынікамі працы федэрацыі ў апошнія гады былы старшыня задаволены. Сапраўды, поспехі нашай нацыянальнай зборнай і моладзевай каманды, клубнага футбола апошнім часам на слыху і кажуць самі за сябе. У сваёй справаздачы Генадзь Нявыглас засяродзіўся на ўпушчэннях і памылках. Ён нагадаў, што цягам апошніх гадоў удалося рэканструяваць і пабудаваць амаль усе стадыёны, якія зараз выкарыстоўваюцца ў чэмпіянаце.

— Мне ўдалося запэўніць кіраўніка дзяржавы ў будаўніцтве футбольных манежаў ва ўсіх абласных цэнтрах, і ў хуткім часе дзеці змогуць займацца там футболам круглы год. Мы пабудавалі Дом футбола. Але працы яшчэ — непачаты край. Маёй марай застаецца нацыянальны стадыён, і гэта пытанне зрушылася з месца.

Генадзь Нявыглас прызнаўся, што рашэнне федэрацыі аб абсталяванні стадыёнаў падагрэвам і штучным асвятленнем клубы не выконвалі:

— Калі б 20 адсоткаў клубы ўкладвалі ў інфраструктуру, усё было б зроблена. А так грошы пайшлі камусьці ў кішэню. Толькі зараз гэтыя нормы замацаваныя заканадаўча.

Генадзь Нявыглас расказаў, што ўдалося падняць і даходы федэрацыі футбола, у прыватнасці, за кошт спонсарскай дапамогі:

— 2008 год, калі пачаўся сусветны фінансавы крызіс, я валявым рашэннем мінімізаваў выдаткі, мы захавалі 3,5 мільёна долараў, якія нам на наступны год вельмі дапамаглі. Не сорамна сыходзіць: я пакідаю добры задзел.

Сярод асноўных недахопаў у футбольнай гаспадарцы экс-старшыня назваў праблемы ў дзіцяча-юнацкім футболе, у прыватнасці, якасць трэнерскіх кадраў, а таксама дрэнную наведвальнасць матчаў:

— Не сакрэт, што некаторыя клубы ў нас гуляюць без балельшчыкаў. І стварацьпрымальныя ўмовы для наведвальнікаў стадыёнаў — галоўная задача на бліжэйшыя гады. Зразумела, што ніхто не хоча ісці на стадыён, калі там капае, цячэ за шыварат.

**Анатоль КАПСКІ: «Сучасны футбол — гэта бізнэс»**

За Генадзем Нявыгласам слова ўзялі Рыгор Суркіс, які адзначыў, што «ўсё ў вас спрыяльна» і «з задавальненнем» адзначыў прагрэс беларускага футбола, і Анатоль Капскі. Апошні растлумачыў, у прыватнасці, і прычыны свайго скандальнага выхаду з выканкама федэрацыі футбола:

— Я павінен падзякаваць Генадзю Мікалаевічу за тое, што ў мяне была магчымасць адкрыта выказваць сваё меркаванне. Я не быў у апазіцыі да Нявыгласа, але ў мяне была свая пазіцыя. Сучасны футбол — гэта бізнэс. Займацца ім могуць і аматары, і прафесіяналы, але стварацьяго павінны толькі прафесіяналы. Асноўная прычына майго выхаду з выканкама — я няўтульна адчуваў сябе ў гэтым органе. Радавыя члены мне кажуць: «Толя, ну што ты ўсё лезеш! Пасядзім гадзінку, паабедаем за кошт федэрацыі...» Таму я заклікаю абраць членамі выканкама не проста дастойных людзей, якімі мы ўсе, несумненна, з'яўляемся, а прафесіяналаў: трэнераў, уладальнікаў клубаў, футбольных спецыялістаў, якія прыязджаць будуць не для абеду ў федэрацыі, не для пропуску ў лепшую ложу на матч, не для таго, каб сесці са зборнай у самалёт і паляцець за мяжу. Я супраць зіц-старшынь, якія ўжо пры некалькіх кіраўніках прасядзелі намеснікамі...

Членамі выканкама абраны 22 спецыялісты, сярод іх Юрый Чыж, Юрый Пунтус, Аляксандр Сяднёў, Віктар Ганчарэнка, Юрый Вяргейчык...

**Сяргей РУМАС: «Нам трэба падвоіць колькасць людзей, якія займаюцца футболам»**

Члены канферэнцыі аднагалосна абралі віцэ-прэм'ера Сяргея Румаса на пасаду старшыні федэрацыі.

— Я ўпэўнены, што маючы вопыт кіраўніцкай працы, уяўляючы, што такое спартыўная гаспадарка, нам удасца працягнуць той рух, які адбываўся пры ранейшым старшыні. За чатыры гады нам неабходна падвоіць колькасць людзей, якія масава займаюцца футболам. Не менш важна развіваць дзіцяча-юнацкі футбол. У нас па-ранейшаму адчуваецца недахоп палёў: дзецям няма дзе трэніравацца і гуляць. Мы павінны стварыць высокаканкурэнтны нацыянальны чэмпіянат, зрабіць так, каб гэты прадукт стаў рэнтабельным, — сказаў Сяргей Румас.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# «АКВАДЗІЎ» — ЯКАСНЫ ПРАДУКТ ПА ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ЦАНЕ

**Кампанія «Аквадзіў» у асаблівым прадстаўленні не мае патрэбы. Яе напоі, мінеральная і пітная вада даўно сталі атрыбутам святочнага стала. А правільна выбраныя напоі — выдатны спосаб прадэманстраваць гасцям: родным, сваякам, сябрам, калегам — свае добрыя адносіны да іх. «Аквадзіў» гатовы надалей падтрымліваць шчырыя і доўгія адносіны са сваімі спажыўцамі. Па іх водгуках, празрыстая, як сляза, пазбаўленая розных дабавак гарэлка з чыстым смакам і прыроднай лёгкай гарчынкай надае своеасаблівую прыгажосць і непаўторнасць напою, зараджае станоўчай энергетыкай. Смак гарэлкі пачынае фарміравацца ўжо на стадыі перапрацоўкі збожжа, з якога вырабляецца спірт. Прычым тут важным з'яўляецца ўсё: і якасць самога зерня, і бальнасць поля, і тэрміны ўборкі, і спосаб яго захавання. Апошняе, як гэта ні дзіўна, часам адыгрывае ключавую ролю ў вытворчасці напояў.**

Новае зернесховішча гарантуе якасць сыравіны ўвесь год.

За пультам кантролю аўтаматызаванай лініі наладчык цэху разліву Аляксандр АЛЕШКА.

## Наша даведка

Няправільнае захоўванне збожжа (напрыклад, ва ўмовах павышанай вільготнасці) у прыстасаваных памяшканнях без прымусовай актыўнай вентыляцыі можа выклікаць так званае «дыханне зерня». Яно — наступства самасагравання збожжа. Паводле інфармацыі вучоных, «дыханне зерня» ўяўляе сабой комплекс складаных біяхімічных працэсаў, якія суправаджаюцца выдзяленнем цяпла. Яно адбываецца пад уздзеяннем мікраарганізмаў, якія трапляюць у зернясховішча ў час уборкі ўраджаю разам з рэшткамі пустазелля, дробнымі каменьчыкамі і кавалачкамі зямлі і пяску. Самасаграванне спрыяе сур'ёзнаму пагаршэнню спажывецкіх якасцяў спірту, калі той будзе выраблены з няякаснага збожжа. Брыдкае «дыханне зерня» перадаецца і на канчатковы прадукт перапрацоўкі: зніжае харчовую каштоўнасць, пры гэтым з'яўляецца нехарактэрны смак, пахі цвілі і гнілля.

## Інавацыйны падыход

Як папярэдзіць псаванне дарагой сыравіны? Адказ вядомы: захоўваць збожжа строга па тэхналогіі, толькі рабіць гэта правільна, у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі — дарагое задавальненне. Не проста кіраўніцтву кампаніі «Аквадзіў» далося рашэнне аб узвядзенні новага зернясховішча. З аднаго боку, патрэбны былі вялікія інвестыцыі. А з іншага боку, у кампаніі ва ўмовах канкурэнцыі, якая ўзрастае, не было іншага шляху вырашыць задачу забеспячэння стабільнай якасці прадукцыі. Бо якасць спірту, паўторымся, амаль поўнасцю залежыць ад збожжа. Якое пайшло на перапрацоўку — такой будзе якасць, смак гарэлкі ды і попыт на яе.

Сістэма відэакантролю дазваляе бачыць на экране ўсе ўчасткі вытворчасці.


Майстар Галіна ШАСТОЎСКАЯ на адным з участкаў цэху разліву, дзе была праведзена рэканструкцыя.

Таму на заводзе пытанне будаваць ці не будаваць зернясховішча доўга не абмяркоўвалася. Вядома, будаваць. Толькі якое? Можна было б узвесці звычайны арачнік. Але ў гэтай канструкцыі вельмі сціплыя, абмежаваныя магчымасці для надзейнага захавання збожжа. І не факт, што ў арачніку яно не сапсуецца да наступнага лета. Як вядома, скупы плаціць двойчы. Каб не апынуцца ў яго скуры, было прынята рашэнне браць крэдыты на ўзвядзенне суперсучаснага зернясховішча на ўзроўні еўрапейскіх патрабаванняў на 24 тысячы тон збожжа. І не памыліліся. У апошнія гады таксама значныя інвестыцыі былі ўкладзены ў мадэрнізацыю вытворчасці спірту. Дзякуючы гэтаму ўдалося без прыцягнення дадатковых энерга- і цепларэсурсаў на 35% павялічыць вытворчасць якаснага спірту. Частка яго цяпер прадаецца на экспарт.

## Sobieski — прадукт ад «Бельведэра»

Тыя, хто здолеў стварыць новы і запатрабаваны прадукт, прасунуць яго на цяжкадасягальныя замежныя рынкі, дасягнуць вялікага камерцыйнага поспеху, становяцца вельмі абачлівыя ў выбары партнёраў. Бо можна замест пашырэння зоны продажаў і дадатковых прыбыткаў атрымаць кучу непрыемнасцяў і праблем. Сярод такіх «пераборлівых» вядомая французская кампанія «Бельведэр» (Belvedere S.A.) з гадавым абаротам больш чым мільярд долараў ЗША. Сувязі кампаніі «Аквадзіў» і «Бельведэр» завязаліся два гады таму. Першыя кантакты — першыя агледзіны, кантракты. «Аквадзіў» набыў партыю французскага каньяку, віскі, віна. Прадстаўнікі «Бельведэра» наведалі Малінаўшчызну і на свае вочы пераканаліся ў тым, што «Аквадзіў» — гэта сур'ёзны патэнцыяльны партнёр. Тут уся вытворчасць сертыфікаваная на адпаведнасць сістэме менеджменту якасці ISO 9001, сістэме кіравання якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў на аснове аналізу рызык і кантрольных крытычных кропак (HACCP), а таксама сістэме менеджменту навакольнага асяроддзя ISO 14001, сістэме кіравання аховай працы СТБ 18001.

Госці станоўча ацанілі поўны цыкл вытворчасці на адным месцы — ад захоўвання і перапрацоўкі збожжа ў спірт да разліву гарэлкі на лініі італьянскай фірмы «Bertalaso». Звярнулі ўвагу таксама на строгую вытворчую дысцыпліну, відэакантроль за ўсімі ўчасткамі і цэхамі, доступ куды дазваляецца па электронных картках толькі для людзей, якія там працуюць. Спадабалася прадстаўнікам «Бельведэра» і аўтаматычная сістэма кіравання канвеерамі, што значна паляпшае вытворчы працэс, дазваляе істотна эканоміць электраэнергію.

У сваю чаргу, прадстаўнікі кампаніі «Аквадзіў» наведалі прадпрыемствы «Бельведэра», дамовіліся аб верагодным ліцэнзійным выпуску ў Малінаўшчызне аднаго з алкагольных брэндаў «Бельведэра». Але ліцэнзія — толькі палова справы. «Бельведэр» пакідаў за сабой права кантролю з выпускам прадукцыі на ўсіх стадыях вытворчасці: назірання за збожжавымі палеткамі (сыравіна будучага напою), умовамі яго захоўвання, тэхналогіяй перапрацоўкі і очысткі. Новае зернясховішча выклікала задавальненне ў французскіх калег, як і ўвесь вытворчы працэс на прадпрыемстве. У выніку французы самі прапанавалі заключыць ліцэнзійнае пагадненне па выпуску гарэлкі Sobieski (Сабескі). Яна, між іншым, уваходзіць у сямёрку самых знакамітых сусветных алкагольных брэндаў.

# БРУС УІЛІС на баку кампаніі «Аквадзіў»

Згоду на вытворчасць Sobieski ў Беларусі таксама даў кіназорка сусветнай велічыні, знакаміты «цвёрды арэшак» Брус Уіліс. Ён уваходзіць у лік важных і ўплывовых акцыянераў «Бельведэра». Брус Уіліс асабіста прысутнічае на прэзентацыях новай прадукцыі кампаніі. Ён падтрымаў прапанову выдачу ліцэнзіі «Аквадзіву». На адным з такіх мерапрыемстваў з кіназоркай пазнаёміўся генеральны дырэктар «Аквадзіва» Алег Рымашэўскі.

— Брус — стрыманы, абаяльны, сціплы і прыемны чалавек без апломбу і нават намёкаў на сваю папулярнасць і выключнасць. Ад яго літаральна адчуваецца станоўчая энергетыка, як і ад яго кінагерояў, якім выпаў лёс стаць выратавальнікам як асобных людзей, так і ўсяго чалавецтва, — гаворыць Алег Леанідавіч.

У кампаніі спадзяюцца, што з лёгкай рукі кіназоркі Sobieski знойдзе свайго пакупніка ў Беларусі.

Генеральны дырэктар «Аквадзіва» Алег РЫМАШЭЎСКІ і ўплывовы акцыянер «Бельведэра», мегазорка сусветнага кіно слынны Брус УІЛІС знайшлі агульную мову.

## Наша даведка

Гарэлка Sobieski вырабляецца з высакаякаснага збожжавага спірту па ўнікальнай тэхналогіі і рэцэптуры XIX стагоддзя. Прадукцыя разліваецца ў бутэльку аб'ёмам 0,5 л. У Еўропе Sobieski завуць «гарэлкай з сярэбранай каронай». Яна названа ў гонар польскага караля і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага. Яго ваенны талент праявіўся ў войнах супраць Асманскай імперыі. Войскі на чале з ім разгромілі турак пад Хоцінам (1673), Львовам (1675) і Венай (1683). Можа, таму сёння Sobieski называюць флагманскай маркай «Бельведэра». У сакавіку 2011 года «Аквадзіў» пачаў першыя пастаўкі гарэлкі Sobieski ў гандлёвую сетку Беларусі. Вытворчасць наладжана па ліцэнзіі французскай кампаніі Belvedere S.A. Яна, акрамя Францыі, мае вытворчыя магутнасці ў Польшчы, Літве, Балгарыі і Украіне.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**
УНН 600391513.

*(Чаму і ў якіх краінах набываюць прадукцыю кампаніі «Аквадзіў», чытайце ў наступнай публікацыі.)*

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ВАШАМУ ЗДАРОЎЮ

## Сярод пацярпелых на «Кастрычніцкай» — 60 навучэнцаў школ, каледжаў і ВНУ

— На жаль, але красавік 2011 года ўжо ўвайшоў у гісторыю нашай краіны як час антычалавечнай па сваёй задуме і ўвасабленні трагедыі на станцыі «Кастрычніцкая» мінскага метрапалітэна, — падкрэсліў у сваім выступленні на II пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі **старшыня ЦК прафсаюза Аляксандр БОЙКА.** — Сярод пацярпелых — 55 чалавек з нашага галіновага прафсаюза, 60 навучэнцаў школ, каледжаў, ВНУ. Двое загінулых — дзеці нашых калег, яшчэ двое — бацькі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Гэтыя ахвяры — наш агульны боль.

У адрас ЦК паступілі тэлеграмы са шчырымі словамі жалобы і спачування ад Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі, ЦК Прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі, іншых роднасных прафсаюзаў. І мы глыбока ўдзячныя ўсяму прафсаюзнаму актыву, які з першых хвілін трагедыі ўключыўся ў агульную справу аказання дапамогі пацярпелым. Нашымі арганізацыямі ўжо выдзелена матэрыяльная дапамога, вырашаны шэраг бытавых пытанняў. Безумоўна, гэтая падтрымка будзе аказвацца і далей. Мы сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў вырашылі пытанні арганізацыі санаторна-курортнага лячэння ў прафсаюзных здраўніцах членаў прафсаюза (і работнікаў, і навучэнцаў) з ліку пацярпелых. Упэўнены, што сёння, як ніколі, актуальныя для нас неабыякавасць і салідарнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Конкурсный управляющий РУПТП «Триор»** (УНП 700067225) – УП «ДжиЭсплюс» (www.GSplus.by) – извещает о проведении 30.05.2011 г. в 12 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 открытых торгов в форме аукциона (на повышение начальной цены) по продаже имущества:

**Лот № 1:** 1) Здание старой подготовки – 393,6 кв. м. 2) Здание чесального цеха – 605,8 кв. м. 3) здание трикотажного цеха – 1618 кв. м; 4) Здание цеха по производству пряжи – 2556,4 кв. м; 5) Здание магазина на проходной – 237,5 кв. м: 6) Административно-производственное здание – 1587,3 кв. м. 7) Здание механической мастерской – 132,4 кв. м. 8) Здание складов – 1218,2 кв. м; 9) Здание цеха войлоков – 1086,8 кв. м; 10) Здание котельной – 967 кв. м; 11) Здание гаражей – 125,9 кв. м; 12) Проездная площадка – 1687 кв. м; 13) Забор кирпичный; 14) Забор железобетонный; 15) Забор металлический; 16) Электросети – трехжильный кабель; 17) Электросети – кабель подземный; 18) Канализация керамическая; 19) Канализация чугунная; 20) Водопровод чугунный; 21) Водопровод стальной; 22) Водопровод технический; 23) Теплотрасса; 24) Паропровод.

Начальная цена 3 198 100 000 рублей. Задаток 319 810 000 рублей. Шаг торгов – 159 905 000 рублей.

Имущество расположено в г. Бобруйске, ул. Менжинского, 6 на территории участка общей площадью 3,34 га, который предоставлен предприятию в постоянное пользование. Территория завода полностью огорожена. Вдоль территории проходит железная дорога. На территорию завода заведены все коммуникации.

Прием заявок происходит по адресу г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 с даты настоящей публикации до 29.05.2011 г. с 9.00 до 18.00, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договоров и др. документов. Телефон в г. Минске: 8(017) 204 68 70. Оплата производится с даты настоящей публикации до 29.05.2011 г. на р/с РУПТП "Триор" № 3012785070016 в ОАО "Белинвестбанк" отд. в г. Бобруйске, код 153801712.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Способ уведомления участников об итогах торгов: в день торгов, публично.

В случае заявки одного участника на аукцион ему будет предложено приобрести выставляемый лот по начальной цене плюс 5 (пять) процентов от начальной цены.

Казімір ФАРЫНО: **Актуальна**

## «Вышэйшы клас педагагічнага майстэрства трэба пастаянна пацвярджаць»

**Прысваенне настаўніку вышэйшай катэгорыі не павінна быць «пажыццёвай узнагародай». Такую думку выказаў, выступаючы на II пленуме ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО. Сёння вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыі маюць 74,6 (!) працэнта ад агульнай колькасці педагагічных работнікаў. Але ці ўсе яны адпавядаюць высокай кваліфікацыі?**

— Наяўнасць вышэйшай катэгорыі разбэсціла педагогаў у плане арганізацыі якаснай работы. Аддачы ад іх малавата, і мы гэта адчуваем, наведваючы ўрокі. А хацелася б, каб аддачы было больш, — патлумачыў сваю думку Казімір Фарыно. — Напэўна, гэтым педагогам ужо няма да чаго імкнуцца? Магчыма, трэба, каб адзін раз у пяць гадоў педагогі з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй пацвярджалі свой вышэйшы клас педагагічнага майстэрства: паказвалі свой досвед, свае напрацоўкі, свае падыходы і свае тэхналогіі. Для таго, каб небеспадстаўна атрымліваць самыя высокія заробкі сярод сваіх калег. Мяркую, што гэта пытанне трэба абмяркоўваць.

Асобна Казімір Фарыно спыніўся на прымяненні ў сістэме адукацыі кантрактнай сістэмы найму. У 2010 годзе колькасць кантрактаў, заключаных на пяць гадоў, павялічылася ў параўнанні з 2007 годам на 10 працэнтаў і складае 37,9 працэнта ад агульнай колькасці заключаных кантрактаў. З работнікамі апарата міністэрства і кіраўнікамі падпарадкаваных арганізацый больш як 66 працэнтаў кантрактаў заключаны на тэрмін ад 3 да 5 гадоў, што на 12 працэнтаў больш, чым у 2009 годзе. Праблемных пытанняў пры прымяненні кантрактнай формы найму ў апараце міністэрства і арганізацыях, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, як правіла, не ўзнікае. Разам з тым у асобных арганізацыях не заўсёды своечасова ўносяцца змяненні ў кантракты ў сувязі са зменамі заканадаўства аб працы, парушаюцца тэрміны заключэння і падаўжэння кантрактаў. Застаецца праблемным пытанне ўстанаўлення дадатковых мер стымулявання работнікаў пры заключэнні кантрактаў у адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 29 з пазабюджэтных сродкаў.

— Я ўпэўнены, што кантракт павінен дзейнічаць толькі там, дзе ён дае нейкі эфект, — дадаў Казімір Фарыно. — Аднак па інфармацыі, якой мы валодаем, павышэнне тарыфнай стаўкі прадугледжана толькі ў 41 працэнце ад агульнай колькасці заключаных кантрактаў. Цікава, а чаму? Чаму прадастаўленне дадатковага заахвочвальнага адпачынку занатаванае толькі ў 76 працэнтах кантрактаў? Кантрактная сістэма — не кампанейшчына. І кіраўнікі арганізацый адукацыі павінны гэтым інструментам карыстацца з розумам. У іх ёсць сёння выбар — заключаць з работнікам кантракт ці бестэрміновы працоўны дагавор. Але за кантрактам абавязкова павінны стаяць стымулюючыя меры...

У кантракце могуць быць занатаваныя наступныя меры дадатковага матэрыяльнага стымулявання працы: павелічэнне тарыфнай стаўкі да 50 працэнтаў, дадатковы аплачаны адпачынак працягласцю да 5 дзён і іншыя. У рэальнасці ж тарыфная стаўка пры заключэнні кантракта, як правіла, складае ўсяго 1 працэнт плюс работніку прадастаўляецца адзін дадатковы каляндарны дзень да адпачынку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

(Аб іншых праблемах, што ўзніклі на пленуме ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, — у бліжэйшых нумарах «Звязды».)

# «ЛЮБЫ ГАСПАДАР РАБІЎ БЫ ГЭТАК САМА Ж...»

## Што пачулі карыснага для сябе ў выступленні Прэзідэнта?

### Апытанне беларускай бізнэс-супольнасці

**Вячаслаў ДОЎНАР, генеральны дырэктар «Белінтэртранс», член Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

— Хачу сказаць, што маё меркаванне ніяк не памянялася, калі б нават гэтае пытанне вы задалі мне тры месяцы таму, месяц таму ці паўгода таму. Усё тое, што за апошнія паўгода, асабліва пасля прыняцця Дырэктывы № 4, я на сваім прадпрыемстве адчуваю і бачу ў сваіх калег і сяброў, хто займаецца нармальным празрыстым бізнэсам, вытворчасцю, экспартам паслуг, імпартазамяшчэннем — усім нам створаны самыя спрыяльныя ўмовы для бізнэсу і далейшага развіцця. Сёння, на жаль, ёсць праблемы з-за гэтай валюты ў тых, хто займаецца імпартам. І можна зразумець Прэзідэнта, можна зразумець урад у тым пытанні, што трэба больш увагі надаваць развіццю ўласных вытворчасцяў. Я поўнасцю падтрымліваю палітыку Прэзідэнта і ўрада ў гэтым кірунку. Вядома, без імпарту не абысціся, але мы да гэтага павінны падыходзіць з асцярожнасцю і з увагай. Прэзідэнт даў зразумець, што той, хто сёння сапраўды патрыёт краіны, хто думае сёння аб правільных і патрэбных напрамках развіцця бізнэсу, той падтрымку атрымлівае і будзе атрымліваць у далейшым. І з выступлення Прэзідэнта я гэта яшчэ раз пачарпнуў і зразумеў, што маё прадпрыемства і ўсе мае новыя напрамкі, якія мы плануем развіваць, на правільным шляху. Таму я нічога не пачуў такога, што б пагоршыла нейкія мае пазіцыі. Я, праўда, займаюся своеасаблівым відам бізнэсу (міжнародныя аўтамабільныя перавозкі), а ёсць яшчэ шмат іншага рознапрофільнага бізнэсу, прадстаўнікоў якога, магчыма, не зусім нешта задавольвае. Але я не магу каментаваць за іх. Я асабіста ўдзячны за выступленне, увесь мой калектыў яго чуў, і я перакананы: цяжкасці, якія сёння ёсць, часовыя. А хто сёння мае валюту — той і ў выйгрышы. Можна так рэзюмаваць: сёння празрысты і нармальны бізнэс без «шэрых» схем — гэта тое, што павінна быць у нашай дзяржаве. І ўсе цяжкасці — часовыя, нармальныя фірмы іх нармальна перажывуць. Можа, нехта са стратамі, нехта без страт, але ў цэлым Прэзідэнт вядзе правільную палітыку, правільную стратэгію і правільна ад нас усё патрабуе. Любы гаспадар на яго месцы рабіў бы гэтаксама ж.

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня ГА «МССПіП» і Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

— Аляксандр Рыгоравіч назваў якраз тыя праблемы, па якіх мы хадзілі апошнія тры тыдні ў міністэрствы і ведамствы. Яны якраз патрапілі ў выступленне, і гэта ўжо пазітыўна, што ён падзяляе нашы ацэнкі, ён назваў гэтая праблемы — і па рэестрах, і па шэрагу іншых момантаў. Але, безумоўна, сёння нам бы хацелася бачыць больш адладжаную працу паміж міністэрствамі і ведамствамі тут, больш моцную палітычную волю ў гэтым кірунку.

**Аляксандр ШВЕЦ, старшыня РГА «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя»:**

— Выступленне слухаў, з яго вынікае, што шмат праблем у нас у эканоміцы і ў краіне. І што зараз іх вельмі няпроста будзе вырашаць. На два месяцы заблакавана нармальная праца з валютай для ўсіх (гэта не толькі для прыватных асоб, але і для заводаў), курс шарахаецца, Нацбанк актыўных дзеянняў не праводзіць... А калі рэгулятары будуць выконваць сваю справу, то, з цяжкасцямі, вядома, але будзем імкнуцца змагацца.

**Уладзімір АБРАМАЎ, начальнік аддзела прамых замежных інвестыцый інвестыцыйнай кампаніі «ЛідарІнвест»:**

— Я магу шмат гаварыць пра гэта, але тэзіс адзін: Прэзідэнт разумее і ўсяляк заахвочвае верхнія эшалоны ўлады наконт падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва. Але галіны гэтай вялікай улады, мякка кажучы, працуюць павольна, а іншы раз іх рашэнні прапрацоўваюцца на месцах не зусім адэкватна. І таму ўсё і ідзе вельмі павольна. Вядома, калі параўнаць з сітуацыяй 2-3 гады таму, то змены каласальныя, сур'ёзныя, але, напрыклад, для выканання задачы павялічыць долю прыватнага бізнэсу ў ВУП да 30% мала што робіцца.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ДА ЧАГО ДАЙШОЎ ПРАГРЭС?
# Даведаемся на tibo-2011

**Інтэрактыўныя сэрвісы, 3D-тэлебачанне, сістэмы відэаканферэнцыі з эфектам прысутнасці... Якімі толькі наваротамі не ўразяць гасцей сёлетняй выставы па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «tibo-2011»! Сваю прадукцыю прадэманструюць больш за 200 фірм з 12 краін. Вачам будзе ад чаго разбегчыся!**

Звычайныя карыстальнікі змогуць пабачыць і апрабаваць усялякія тэхнічныя навінкі. Адчуйце смак наперад. Арганізатары прыадкрываюць заслону. Пра сістэмы відэаканферэнцый, якія прадставіць на форуме кампанія Huawei, згадвае Рыгор БОНДАРАЎ, дырэктар ЗАТ «Тэхніка і камунікацыі». Ён называе эфектыўнымі рашэнні, якія дазволяць праводзіць карпаратыўныя нарады, не пакідаючы свайго працоўнага месца. А тэхналогіі трохмернага друку чаго каштуюць... Па сутнасці, паслойнае вырошчванне пэўнай мадэлі. Распавёў спадар Бондараў і пра найноўшыя мабільныя дадаткі. Напрыклад, мабільнае здароўе — сэрвіс, які дазваляе і ў камандзіроўцы заставацца на сувязі з доктарам: аддаленыя кансультацыі, карацей. Звярнуў увагу таксама на праект кампаніі «Блу-Медыя» — стварэнне блютуз-сеткі ў Беларусі. Вытворцам гэта дае новае поле для рэкламы сваёй прадукцыі, а нам, звычайным карыстальнікам, магчымасць атрымліваць інфармацыю бясплатна. Блютуз — тэхналогія бесправодной перадачы звестак на малыя адлегласці пры дапамозе радыёхваль. Сталічная кінаафіша, напрыклад, даступная такім чынам ужо сёння.

Будзе прадстаўлена на форуме і мабільная сувязь чацвёртага пакалення. Якая, натуральна, яшчэ больш эвалюцыянавала ў параўнанні з папярэднімі пакаленнямі сувязі. Яна характарызуецца высокай хуткасцю перадачы звестак і павышанай якасцю галасавой сувязі. Заснавана такая мабільная камунікацыя на пакетных пратаколах перадачы звестак. А неабходныя для такой сувязі LTE-частоты айчынным аператарам мабільнай сувязі яшчэ давядзецца атрымліваць на конкурснай аснове.

— Цяпер прапрацоўваюцца ўмовы, і, папярэдне, у пачатку верасня будуць падрыхтаваны конкурсныя дакументы, якія прадставяць усім, хто захоча ўзяць удзел, — паведаміў журналістам намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Сяргей НЕСЦЯРОВІЧ.

Ён таксама зазначыў, што беларускі бок дагэтуль не прыняў канчатковага рашэння наконт продажу сваёй долі ў кампаніі МТС (нагадаем, гэта кантрольны пакет — 51%).

— Цяпер гэта пытанне прапрацоўваецца і ва ўрадзе, і ў Дзяржкаммаёмасці, — канстатуе намеснік міністра. — Якая будзе далейшая сітуацыя, пакажа толькі час.

Прафесіяналы ІТ-індустрыі абмяркуюць злабадзённае для галіны на кангрэсе. Сярод ключавых тэм выканаўчы дырэктар РГА «Інфармацыйная супольнасць» Сяргей ЕНІН назваў аб'яднанне тэлекамунікацый і СМІ, стратэгію пераходу на лічбавае тэлерадыёвяшчанне, ахову аўтарскіх правоў, інтэрнэт-маркетынг, электронныя паслугі. У мабільных тэхналогіях, заўважце, акцэнт ужо даўно робіцца не столькі на самую сувязь, колькі на сэрвіс, паслугі. Сваім вопытам з беларускімі калегамі падзеляцца літоўскія спецыялісты. Цікавым абяцае быць і выступленне на кангрэсе віцэ-прэзідэнта кампаніі Microsoft.

А інтэрнэт-прэмія TIBO вызначыць лепшых у байнэце па розных намінацыях. Самы высокі конкурс, здаецца, у галіне здароўя і медыцыны: пададзена 76 заявак. Шмат прэтэндэнтаў і на званне лепшага карпаратыўнага, а таксама інфармацыйнага рэсурсу. Аўтарытэтнае журы з ІТ-спецыялістаў, прадстаўнікоў творчых саюзаў, навукоўцаў, журналістаў і дзяржаўных службоўцаў будзе ацэньваць змест і візуальнае афармленне сайтаў, структуру і зручнасць навігацыі, інтэрактыўнасць і г. д. Паглядзім, якія сайты атрымаюць своеасаблівы знак якасці. Цырымонія ўзнагароджання прызначаная на 28 красавіка ў 17.00.

З заканчэннем пяцігодкі летась завяршылася і праца над праграмай «Электронная Беларусь». Дасягнутыя вынікі, паведаміў С. Несцяровіч, будуць прадэманстраваны на форуме. Прагрэсіўныя беларусы ўжо на ўсю моц карыстаюцца дабротамі цывілізацыі: электроннае дэкларыраванне, электронныя талоны да ўрача і электронная чарга ў ЗАГС — самае распаўсюджанае ў штодзённым ужытку. Абмяркуюць і планы ў ІТ на наступную пяцігодку: будучыня пачынаецца сёння. Што ж зробіш, у такі час жывём. Даводзіцца бегчы вельмі шпарка, каб хоць бы заставацца на месцы.

**Ала МАЧАЛАВА.**

**TIBO-2011**
**з 26 па 29 красавіка**
Мінск, Футбольны манеж (пр. Пераможцаў, 20/2)
*tibo.by*

## Здарэнні

### БЕЛАРУСКІ ШТАНГІСТ СЯРГЕЙ ЛАГУН ЗАГІНУЎ У АЎТАМАБІЛЬНАЙ КАТАСТРОФЕ

**Пра гэта паведамляе карэспандэнт БЕЛТА. У машыне з Сяргеем быў яшчэ адзін беларускі цяжкаатлет Яўген Жарнасек, які цяпер знаходзіцца ў рэанімацыі.**

Сяргей Лагун — удзельнік Алімпійскіх гульняў, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянату свету, чэмпіён свету і Еўропы сярод юніёраў.

Яўген Жарнасек на чэмпіянаце Еўропы, які нядаўна завяршыўся ў Казані, у вагавай катэгорыі звыш 105 кг заняў 4-е месца ў дваяборы.

### АРТЫЛЕРЫЙСКІЯ СНАРАДЫ Ў ВЁСЦЫ

**У вёсцы Ліпаўцы Віцебскага раёна пры правядзенні земляных работ знайшлі 10 артылерыйскіх снарадаў, 2 міны і гранату.**

Як устанавілі сапёры, якія аператыўна прыбылі на месца небяспечнай знаходкі, арсенал гэты часоў Вялікай Айчыннай вайны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**с условием по продаже объектов, принадлежащих на праве собственности Брестскому районному потребительскому обществу**

**Лот № 1:** здание бани, расположенное по адресу: Брестский р-н, Катин Бор. Общая площадь здания – 87,1 м кв.
Начальная цена – 24 000 000 белорусских рублей, без НДС.
**Лот № 2:** здание грибоварни, расположенное по адресу: Брестский р-н, Катин Бор. Общая площадь здания – 29,6 м кв.
Начальная цена – 8 000 000 белорусских рублей, без НДС.
Размер задатка для участия в аукционе – 10% от начальной цены объекта. Оба объекта продаются с условием организации в них центра белорусской культуры (занятие народным промыслом).
Прием заявлений заканчивается 2 мая 2011 г. в 09.00.
Аукцион состоится 02.05.2011 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Нефтяная, 10. Организатор аукциона – Брестское районное потребительское общество.
**Контактные телефоны: 8 (0162) 23 16 23; 8 (029) 722 48 06.**

*УНП 200224506*

**КПУП «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА» (организатор аукциона)**
**извещает о проведении 13 мая 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (Одноэтажное кирпичное здание реагентного хозяйства), площадь 627,8 кв.м, инв. № 350/С-73891 | г. Гомель, ул. Лепешинского, 7 | 211 200 000 | 20 000 000 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Коралл». **Имущество расположено по адресу:** 246000, г. Гомель, ул. Лепешинского,7. **Шаг аукциона – 5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по 11 мая 2011 г. включительно. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Открытое акционерное общество «Коралл»): р/с 3012000490013, в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Гомельской области УНП 400051785 МФО 151501360.**
**Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34.**

## Ну і ну!

### ГВАЛТАЎНІКА ВА УЦЁКАХ ЗАТРЫМАЛІ ЛЯ ВАКЗАЛА

У Віцебску на плошчы ля чыгуначнага вакзала супрацоўнікі транспартнай міліцыі затрымалі 21-гадовага асуджанага, які самавольна пакінуў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. 21-гадовы хлопец быў асуджаны за згвалтаванне, хуліганства і давядзенне да самагубства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ТАНЦЫ НА КАПОЦЕ

На аўтадарозе каля в. Карчова (Баранавіцкі раён) стаялі аўтамашыны, якія чымсьці не спадабаліся 22-гадоваму жыхару в. Скробава.

На аўтамабілі «Ровер 200» ён разбіў шкло, а затым ускочыў на капот а/м «Kia Кларус». Хулігана затрымалі.

### ПРАДПРЫМАЛЬНІК «НАГРЭЎСЯ»

Ноччу з тэрыторыі будаўнічага аб'екта, які знаходзіцца каля аўтамагістралі Брэст—Мінск, было скрадзена 15 м куб. уцяпляльніка коштам 4 млн 285 тыс. рублёў.

Аператыўная група ўстанавіла, што злодзеем з'яўляецца ІП з г. Івацэвічы.

### СВОЙ ЗЛОДЗЕЙ

Галоўны механік ААТ «Пачэпава» (Пінскі раён) заявіў у міліцыю, што нехта ноччу ўкраў з трактара «МТЗ-3022», які стаяў каля майстэрні, кранштэйн-процівагу.

Аказалася, што той кранштэйн коштам 11 345 113 рублёў зняў рабочы гэтага ж прадпрыемства, 20-гадовы жыхар в. Купяцічы. Злодзея затрымалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Слухай сваё!

# ВЫГНАЦЬ «ЗІМАЧКУ» З СЭРЦА
# дапаможа этна-трыа «Троіца»

**ГУРТ прапануе забыць пра халады ды маразы, прадставіўшы... новы альбом «Зімачка». Ды і сапраўды — вясна ў разгары! Час адысці ад спячкі, расправіць крылы і спяваць. Ці слухаць, як спяваюць іншыя. 27 красавіка такая магчымасць будзе ў тых, хто наведае канцэрт на малой сцэне канцэртнай залы «Мінск». Гэта свайго роду эксклюзіўная прэзентацыя альбома для малой колькасці народу. Аднак у саміх музыкаў месца правядзення канцэрта выклікае надзею, што падчас выступлення будзе добры гук, а гэта вельмі важна для таго, каб адчуць веснавы смак спеваў «Троіцы».**

— Можа, дзіўна, што зараз выходзіць альбом пад назвай «Зімачка», — кажа Іван Кірчук. — У ім ёсць песня такая. І пачалі працаваць над ім мы напачатку зімы. Аднак у альбоме ёсць філасофскі ўступ, што хутка будзе адліга... Мне здаецца, зіма таксама мае свой характар, гэта не толькі снег, завея. Мы доўга шукалі назву гэтага дыска. Былі розныя словы, таму што тут вельмі шмат вясельных песень. Нам падалося, што ў ім ёсць усе фарбы зімы.

Падчас запісу альбома «Зімачка» музыкі вельмі дбалі пра гук. Таму што большасць песень ужо не раз гучалі на канцэртах, фестывалях. Заставалася іх толькі запісаць. Аднак студыю для гэтага шукалі больш за год. Спачатку разглядалі ўсе варыянты ў Мінску (яны больш танныя). Але вырашылі паехаць у Польшчу, нягледзячы на большыя выдаткі. На «TR-studios» пад Варшавай працавалі больш за пяць тыдняў, часам па дзесяць гадзін у суткі. Для гэтага былі ўсе умовы: студыяй кіруе Томаш Рогула, які быў двойчы намінаваны на «Грэмі». Тут, што называецца, сышліся зоркі: гурманы гуку з Беларусі знайшлі аднадумцу.

— Студыйныя магчымасці надалі нам такія крылы, што мы прапісалі больш за 400 трэкаў, можна прасачыць, як Кірчук спявае на пяць галасоў, Дзмітрыеў грае на пяці гітарах, Паўлоўскі таксама грае на шматлікіх ударных інструментах, — гаворыць Іван Кірчук. — Калі трэба было запісваць вакал, Томаш Рогула выставіў 10 дарагіх мікрафонаў, я ў кожны праспяваў фразу, а потым мы слухалі і выбіралі, у які спяваць...

Адна адметнасць гэтага альбома — пасля альбома «Сон-трава» музыкі пайшлі далей. Тут толькі дзевяць трэкаў, а альбом больш за гадзіну гучыць. Амаль у кожнай песні ёсць інструментальныя кавалкі, прычым яны накіраваныя больш на стварэнне адпаведнай атмасферы.

— Шлях да гэтага альбома быў складаны і вельмі доўгі, — кажа Юрась Паўлоўскі. Адметнасць дыска ў тым, што адзін з трэкаў быў зроблены менавіта перад выездам, ён нідзе ніколі не выконваўся. Падчас працы ў нас было шмат вольнага часу. Самае цікавае, што на кампакт-дыск трапіў твор, які быў напісаны падчас вольнага часу. Свайго роду эксперымент, які адбыўся непасрэдна ў студыі. Таму што з намі працаваў прафесіянал з вялікай літары і вельмі захоплены сваёй справай чалавек. Мы захоплены сваёй музыкай, чалавек захоплены гукам, таму адбывалася шмат гукавых эксперыментаў. У выніку атрымаўся даволі незвычайны для нас альбом, бо не было папярэдне выпрацаванай канцэпцыі, усё атрымлівалася падчас працы. У выніку трэба сказаць, што яго ўнёсак вельмі значны. Мы шкадуем толькі пра адно, што крышачку ў нейкіх рэчах не хапіла часу.

